Garecki, Maksim. Nr. 599

Cichaje plyn-apovesc'
Men sk-1930 god.

Der stille Fluss.
Novelle.
Minsk-1930.

МАКСІМ ГАРЭЦКІ

ЦІХАЯ ПЛЫНЬ

БЕЛДЗЯРЖВЫДАВЕЦТВА
1930

М. ГАРЭЦКІ

ЦІХАЯ ПЛЫНЬ

ВЫДАНЬНЕ ДРУГОЕ

БЕЛАРУСКАЕ ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА
МЕНСК — 1930

Заказ № 282. 3.000 экз. (3¼ арк.). Галоўлітбел № 592.

Друкарня Беларускага Дзяржаўнага Выд-ва.

АД ВЫДАВЕЦТВА

«Ціхая плынь» была напісана аўтарам яшчэ да рэволюцыі і першы раз друкавалася ў 1918г., у расійскім перакладзе, у першамайскім нумары «Известий Смоленского Совета», пад назваю «За што?».

Аўтар, пішучы гэты твор, ставіў сабе, у выніку свайго тагочаснага сьветагляду і настрою, такое добрасардэчнае інтэлігенцкае пытаньне: за што пакутваў праз усё ваё кароткае жыцьцё і за што быў забіты на імпэрыялістычнай вайне сын беларускага селяніна-бедняка, «гісторыю» якога ён хоча даць у гэтым сваім творы.

Падобнае пытаньне мог ставіць сабе толькі той аўтар, што хоць і спагадаў свайму герою, але-ж ня мог паказаць яму шляхоў да вызваленьня, дзеля таго што не праламляў у сваім творчым падыходзе актыўна-рэволюцыйнай пролетарскай псыха-ідэалёгіі.

Няма ў аповесьці тых аганькоў, што сьвяцілі ў дарэволюцыйнай цямноце, падаючы надзею на блізкі надыход нашай сучаснасьці, калі сыны беднаты, знайшоўшы пад кіраўніцтвам пролетарыяту шляхі да вызваленьня і здабыўшы гэтае вызваленьне, з велі-

зарным пераможным імпэтам і размахам перабудоўваюць апісаную аўтарам вёску на соцыялістычны лад.

З фармальна-мастацкага боку твор мае таксама значныя недахопы. Аповесьць складаецца з паасобных абразкоў-момантаў, болей-меней зьвязаных між сабою толькі асобай героя. Мы не знаходзім тут цікавай інтрыгі, багатай фабулы, і з гэтага пункту погляду твор ня можа глыбока ўсхваляваць аўтара.

Аднак-жа як ужо зазначала наша літаратурная крытыка, абразкі, з якіх складаецца «Ціхая плынь», напісаны з праўдзівым пачуцьцём, з добрым веданьнем дарэволюцыйнага беларускага сялянскага быту і даволі багатаю, блізкаю да народнай, моваю. Гэтыя асаблівасьці набываюць яшчэ большае значэньне, калі ўзяць пад увагу невялікі запас твораў у беларускай літаратуры дакастрычнікавага пэрыоду.

І калі наш чытач пазнаёміцца з дарэволюцыйным беларускім сялянскім бытам і яго адлюстраваньнем у беларускай літаратуры дакастрычнікаўскага пэрыоду, ён будзе мець пэўную карысьць, прачытаўшы «Ціхую плынь», але пры ўмове крытычнага падыходу да яе недахопаў з пункту погляду пралетарскай ідэолёгіі.

Адзначаем, што ў першым беларускім выданьні (1926 г.) аўтар даў аповесьці назву—«Ціхія песьні», якую для гэтага выданьня выправіў на «Ціхую плынь».

ЗАБЫТЫ КРАЙ

З ЛЕВАГА БОКУ Няпра, за дзень летняе хады ад яго, абнятае з трох бакоў балотамі ды хмызьнякамі беднай Плёскі, прытулілася тое Асмолава пры вялікім некалі шляху з Вялікага Княства Літоўскага на Масковію.

Мялее і нядужае стары нябога Няпро. І потымтаго выбілася з духу Плёска. Дзе зусім парвалася, усохла, кінуўшы знак калішняй магутнасьці—глыбокі замуравелы равок-рэчышча; дзе расьцяклася далінаю, зрабілася багнам, вязкім і непраходным, зарасла купнікам і вербалозам; троху-троху блішчыць яна абы-дзе рудым, як помаз, іржавеньнем спаміж зялёнай асакі, залатога балотнага казельцу і курасьлепу. На высокіх купінах—багун, мядуніца. Тхне зялезам... У цёмную восеньскую ноч страшыць Плёска нямою глухатою адзіноту-падарожнага; быццам нешта чорнае з купніку вылязае, стаіць...—так здаецца яму.

Заглушэў зусім вялікі стары шлях. Размыты з бакоў веснавымі ручаямі; пакарбачан даўнымі засохлымі калюгамі; дзе вышэй—парос калматай муравою, дзе ніжэй—шурпатай маці-мачыхай. Спустошыўся і змоўк.

Дзень і ночы, зіму і лета, маўкліва-патаённа думае думы, якім борздым лётам ляціць усё ў вечнасьці. Пабіты пярунамі прыдарожныя бярозы. Дагубілі іх сваімі вогнішчамі начлежнікі і пастушкі. Якія-ж неяк яшчэ ацалелі,—быццам сіроты маячуць яны, бедныя; старыя, дуплё на дуплі, каржавыя. І яшчэ болей наганяюць пустэльнаму шляху смутных успамінаў; ціхім, роўным векавечным гоманам веццяў свайго яшчэ болей дадаюць тут глухаты, пустэльнасьці і маркоты.

У кутку крутой дугі, якою выгнулася Плёска, сьпіць гара, а на гары там—гарадзішча. Нейкія курганкі і могілкі; заімшэлыя каменныя крыжы, роўнабокія, грубыя, са сьцёртымі ад даўных часоў нейкімі літарамі і ўсякімі зусім незразумелымі насечкамі; яны ўехалі ў зямлю, а вакол іх валяецца пакрышаная цэгла, чырвона-бураватая, старая, чорны аскялёпак дрэва; дзікае зельле з былінкамі, у якіх глуха звоніць вецер,—і больш няма нічога.

Ніжэй, на шырокім зялёным сухадоле ўжо ў пазьнейшыя часы паставілі шчырыя цёмныя людзі над крыніцаю каплічку. У ільлінскую пятніцу бывае тут адправа. З усяе акругі зьяжджаюцца спаленыя летнім сонейкам сяляне. Увесь лог, з лёгкім і прыемным водарам пакошанай травы і пахам дзёгцю, уся дарога і гарадзішча застаўлены вазамі, конямі і белымі шатрамі, поўны людзкога натаўпу з ягоным вясёлым і гульлівым, а разам-жа і сумным гоманам і шумам. Да трох дзён грымеў тут некалі кірмаш з бойкім торгам і ўсякай весялосьцю... Апошнія гады усё меней

зьбіраецца народу, цішэй гудзіць дуда і цішэй галосяць дудкі-пасьвісьцелі (так завуцца тут падвойныя жалейкі); ня так дужа і ня так шчыра пяюць сьляпыя старцы пра таго божага ўгодніка Лазара і толькі дзеля гадзіся пагражаюць пякельным агнём грэшнаму люду. Пагрыміць часам новенькі венскі гармонік; не зважаючы пройдзе сярод барвіста прыбраных дзевак і сапрэлых хлопцаў разудалы гарманіста ў лякірованых бліскучых ботах, троху запыленых; там яшчэ пакажацца музыка ў шэрым жупане нараспашкі з іскрыпкаю пад пахаю і азука-хлапчук, музыкін памагачы, з бубнам у ваднэй руцэ і булдавешкаю ў другой. Не даючы веры, падзівіцца моладзь на тры-чатыры столікі з убогімі, занадта сходнае цаны, ласункамі і, мінаючы Асмолава, усе пацягнуць над-вечар у Лугвенева, дзе ёсьць гасьціныя каморы з прыемнай прахалодаю і ня дужа цёплым «баварскім» півам для вясковых госьцікаў.

Старыя граматы і акты гаспадарства, у кругабегі вялікіх разбурэньняў пазаглабаныя ў бібліотэкі чужых краёў, ня мала пішуць пра вялікае Лугвенева ў сівой мінуўшчыне. Цяпер яно—забыта шумным сьветам і ціха сьпіць... Разбурылася старыннай архітэктуры сінагога з дахам, падобным троху да цікавых дахаў на азіяцкіх пагадах і кумірнях,—яе зьняў на фотографію сваім чорным кадаком даўгі, як прасла, з нагамі як у бусла, сухапары ангелец у гетрах, што гасьцяваў у князя ў палацы. Патрошку разбураецца, за рэчкаю, на ўзгорку, у ліпах і клянох, стары аблуплены палац

дурнаватых князёў Кандыб-Лугвенічаў, недалужненькіх патомкаў лугвенеўскага заснавальніка, князя Лугвеня, пра якога пішуць кронікі, што быў гэта выдатны розумам і вайсковым спрытам князь. І сумятлівая яўрэйская галота, з адубелым або-ж і пагандлярску-ахіжаным біблейным сумам у ваччу, і п'янаватыя, у беленькіх магерках, падобных да турэцкіх фэсак, мужыкі з Асмолава, Гарадца і ўсяе воласьці, з такім самым застыглым смуткам у ціхім або і пахавана-злосным выглядзе—няўважна месяць гразь на вуліцах Лугвенева, чвякаючы дзіравымі бацінкамі і калматымі лапцямі-атопкамі, або шалёпаючы падкованымі ботамі; ато ўздымаюць шэры, важкі пыл з пахам поту і дзёгцю, уздымаюць там, дзе некалі, як пішуць вучоныя гісторыкі, шумела вольная рада магутных і ганарлівых продкаў нашай белай косьці, там, дзе гудзеў звон рады і бразгала гострае шабельле. Можа і так! У самым пасяродку Лугвенева прысела, быццам, квакуха, памалёваная летась, як езьдзіў архірэй, царква; вакол яе—усьцяж крамы з дзьвярмі пад агульнаю паветкай-галдарэяй, і там гнілы памост, увесь у дзірках, і тыя дзіркі якраз перад дзьвярмі. Ля крам туляюцца галодныя рэбрыстыя сабакі і ходзяць або бегаюць, зьбіраючы раструшанае сена і ўцякаючы ад пугі ў руках пакрыўджанага дзядзькі, спрытныя і хітрыя старыя козы і такія-ж, але яшчэ спрытнейшыя малыя козкі. Яшчэ-ж далей зьляпіліся аднэю кучаю розныя будынкі, манаполька і шаўцова хата. Шаўцова хата—без варот, з аднэю шулаю, і адтуль

хлопчыкам вельмі зручна кідаць з-за шулы шубінаю ў сабак і коз.

Прыяжджаў яксьці па вясьне, з даўганогім сябрам-чужаземам, князь; прадаў нейкім наезным з Смаленску ці адкуль яўрэям і ў кампаніі з імі лугвенеўскаму Лейбе Бруднаму кавалак лесу паміж Асмолава і Гарадца, што завецца Зуброў Загон; а яшчэ скінуў старога аканома-латыша, пасадзіўшы на яго ваканцыю новага чалавека, нейкага эстонца, паклаў у садзе, на магіле свайго дзеда, новы плінтус з напісам папольску і палатыні, і пасьля першага падвосень холаду зьехаў ізноў у сьвет, адкуль быў прыехаўшы.

Скрозь цэлае лета, як толькі сьвяты дзень, хадзілі да князя асмолаўцы, каб дабром дайсьці да ладу з несправядлівымі абрэзамі і выпрасіць палёгку на пашу і на ўругу. «Навёз ваш аканом каморнікаў ды грабароў,—з жалем выкладалі яны князю сваю крыўду,—прырэзаў вокрайкі нашых шнуроў да лесу вашай сьветласьці і па ўсёй новай лініі канавы пакапаў... дык дзе-ж тут якая праўда?»—«Пачакайце—ласкава казаў ім князь, аглядаючы новенькую, прывезеную з чужога краю стрэльбу ці лезучы з тым чужаземам на даўгія дрожкі і балбочучы з ім пачужаземнаму,—а стаенныя коні тупалі і не стаялі,—«пачакайце»... Даведаліся асмолаўцы, што князь ізноў (надоўга, мусіць) зьехаў,—і бяз ніякай цырымоніі, узлаваныя, пасунулі будзёным мокрым днём, такою хлюпаю, у кантору гаманіць з эстонцам. Зазлаваўся і эстонец, новы аканом, пачырванеў, вяхнуў: «Будзем пачакаць!»—і па-

йшоў па гаспадарцы: на стайню і ў абору. Ці за ім ганяцца?

А ганей за двое ад палацу, за клянамі і ліпамі, у старых, вялікіх вербах, што парасьлі над Плёскаю, высачэе над нізкімі будынкамі закураны, высокі-высачэнны цагляны комін—тут князеў бровар.

Усю зіму асмолаўцы і гарадчане пояць ля бровару, у шырокай студні пад круглаю гантоваю павецьцю, сваіх дробных, калматых, замардаваных коняй, ускачваюць на сані па-дзьвюх дошках важкія бочкі з сьпіртам і скідаюць парожнія. І на старым шляху ўзімку троху тлумней і весялей. Інагды цягнуцца даўжэнныя абозы з хлебароднай Амсьціслаўшчыны. Вязуць людзі, апрануўшыся ў вялікія шэрыя армякі з шырокімі каўнярамі, падбітыя белымі і нават чорнымі аўчынамі, вязуць ад месьцячковых скупшчыкаў сваю і панскую пяньку, лён, канаплі і семя, і з нейкім грэблівым, зьняважлівым падзівам паглядаюць на кароткія, «на вілачках», белыя сьвіткі ў асмолаўцаў; яны пільнуюцца свой свайго; а калі едуць назад, лёгкімі вазамі з бакалейнымі і краснымі таварамі, дык не варочаюць з дарогі перад цяжкімі вазамі асмолаўцаў: ім карціць, каб сьцебануць даўгою пугаю чужую кабылёнку; а на заезным двары ў Лугвеневе яны жартуюць і дурэюць, маюць сябе за панібрата з самым Ёськам, гаспадаром заезду, п'юць гарэлку цэлым грудам, ядуць сала і драчаны з салам; яны са сьмехам міргаюць той таму, калі высокі, худы і белабрысы асмолавец, з дзьвюмятрымя валасінкамі замест людзкай барады, і ў сваёй

сьвітцы—«на вілачках божы страх», і ў сваіх жыдзеньківх, не па сьцюжы, пасканных штанох, туляючыся і хаваючы вочы, адзінцом вып'е сотку, згрызе сухі таран, прымасьціцца рачыкам у дзіравых «копаніках» (санках, з нягнутага, а копанага ў лесе, з крывых карэньняў, вобадзьдзя)—і патурыць хударлявую сваю кабылку, з белымі ад шэрані бакамі і выпнутым калматым брухам, па дарозе на паснулае Асмолава... Міргаюць і сьмяюцца.

Тое, што блізка Лугвенева з яго корчмамі і броварам,—губіць асмолаўцаў. Стары «літоўскі» шлях можа пасьведчыць, колькі зьмёрзла на ім нядбалых сьпіртавозаў, едучы з Харошага—станцыі за Няпром, куды цягаюць сьпірт. Бацька Няпро можа пасьведчыць, колькі залілося іх на пераправе, залілося з якоюсь хмельнаю пагардаю і няўважнасьцю да жыцьця і да ўсяго на сьвеце.

Дзікай травою красуюць палеткі. Гніюць і праваліваюцца стрэхі. Хлопцы едуць у шахты і на фабрыкі, і наогул «у сьвет», але шлюць яны адтуль часьцей лісты з уклонамі старому і малому, чымся пяць, тры ато хоць-бы адзін рубель. І што году наяжджае валасное начальства спаганяць нядоімкі, наяжджае з грудам асмолаўскіх махляроў рабіць продаж мужыцкай маемасьці з торгу. І сьмяюцца начальнікі і махляры: прадаваць бо ня дужа чаго ёсьць. А тыя асмолаўцы возяць а возяць князёў сьпірт, болей а болей нялюдзеюць і хаваюцца самі ў сабе. Ат, ліха з ім, са сьветам, тлумным і незразумелым... Хаваючыся адзін

перад адным, усё шчыльней лезуць яны ў дружбу з лугвенеўскімі шынкарамі, кажучы ім у хмялю: «Ат, пыні, і вашая доля ня лепшая. Згнецены вы тут, як селядцы ў цеснай селядцоўцы. Трэба-ж і вам хлеб прамысьляць»... Усё сьмялей ідуць старыя дзеўкі і салдаткі ў месьцячковыя ваданоскі і няньчыць дзяцей у заможных яўрэяў. Але, мусіць, дрэнна няньчаць іх, бо не пяюць іхныя гадунцы аб долі-нядолі тутэйшага краю, змалку думаюць яны аб іншых, сьветлых, чыстых і багатых старонках, а тутэйшая поэзія для іх—мужыцкая, цаны ня мае... А старэнькія, белабародыя законьнікі, у круглых чорненькіх ярмолках, з акулярамі над «бубліяй», чакаюць абяцанае гадзіны, калі пакіне іх народ «чужыну», дзе гасьцяваў ён соткі год, і пасунецца за горы і за моры, у сваё спрадвечнае панства, што па волі грознага, але і праведнага Егавы мае паўстаці з мёртвых. Пагаманіўшы з законьнікам, дзівуецца, падвыпіўшы, стары асмолавец. Як-жа гэта будзе, калі ня будзе тут яўрэяў? А хто-ж будзе прадаваць усё-што патрэбна чалавеку: махорку, сернікі, соль, і селядцы, і газу? Хто-ж тады пашые боты і хамут і зробіць вакенныя асады ў новай хаце?

Усё пільней кукобяць думку асмолаўцы аб нейкім дзіве—ці-то аб зямлі, ці-то аб волі. Вось нехта аб'явіцца і прынясе дзіва з сабою...

Аб'явіўся год пяць таму назад у Гарадку «прарок», начытаны ў біблії і брусавым календары. ...«Ї пройдзе, казаў ён, слых пра Лугвенева па ўсенькім сьвеце. Тут

будзе асяродак правае веры, сюды з усіх старонак і ад усіх народаў пойдуць пабожныя людзі на ўклон сьвятому духу. Разрасьцецца Лугвенева, сьвятое места, ува ўсе бакі, да Асмолава і за Асмолава, можа пад самы аж Няпро. Многа-многа, бяз ліку будзе ў ім збудована будынкаў, там дзе цяпер, у полі, расьце палын ды кукаль. На гарадзішчы ўзноў падымуцца, як у старадаўны час, вялікія муры, а сьвятыя людзі, што жылі там за часу нашых даўных-даўных прадзедаў, будуць пяяць ужо ня толькі ў купальскія або рабінавыя ночы пад зямлёю, але наяве будуць жыць спаміж жывых людзей...» Усё гэта будзе, казаў мужыком прарок, трэба адно з належнымі малітвамі... забіць дзіцятка мусіяша, што нарадзілася ў яго суседа! Бо той сусед, як і «прарок»—яго таварыш, рабіў сам з сабою блуд змалку і да жаненьня, і жонка такога чалавека магла прынесьці сына хіба толькі ад нячыстай сілы... Задурыў «прарок» людзей! Улетку ўвечары, з поля з працы вярнуўшыся, мужчыны і бабы ў белых да пят кашулях, наўмысьля на тое пашытых, маліліся ў «пророкавай» хаце па старой, воскам закапанай кнізе, пяялі псальмы, плакалі-гудзелі і набіраліся духу на вялікую справу. А бедная маці, нічога ні ад кога ня ведаўшы, але ўжо чуючы нешта нядобрае, сядзела тады адна ў хаце, калыхала маленькага і пяяла яму «Люлі-люлі-люлі, прыляцелі куры»... Ня куры, а коршуны прыляцелі ў хату, адабралі маленькага — «прарок» і сам бацька, адурэлы, адбіралі,—раздушылі, разадралі яшчэ не аднятае ад гру-

дзей дзіця, у мяшок завязалі, да конскага хваста прывязалі і ў поле пусьцілі... Узьлез тады «прарок» на гумно—ляцець на неба, і споўз, як дурань. Забрала паліцыя і яго і яшчэ многіх. Гады тры бавілі па судох, па вастрогах. Наяжджалі вучоныя профэсары, абмяралі чырвоным матузком і бліскучым цыркулем «прароку» і выдатнейшым гарадчанам калматыя галовы, глядзелі ім у рот... Тым справа абышлася. Усіх пусьцілі-ткі «на волю».

Нехта бавіцца вякамі і ня прыходзіць.

Адылі-ж і тут бываюць гульні і сьмех, ігрышчы і вечарынкі. Трасе «трасуху» на старой, дрынчатай скрыпцы дзядзька Цімох. Як сарамлівая дзяўчынка навучаецца скокам на гумне за асецьцю, так і асмолаўцы, свае сярод сваіх, вясёла гоцаюць «трасуху» і «лявоніху»; як праўдзівыя камары, таўкуць «мак»; мітусяцца ў «мяцеліцы». Пяюць сумныя, ціхія песьні, даўныя-даўныя, і самі складаюць новыя прыпеўкі. Гэтак бесклапотнае дрэўца ціха зелянее, хаця-ж злыбедная машкара выела яму сэрца.

ГЕРОЙ ГІСТОРЫІ

ЦІ ДАВОДЗІЛАСЯ вам праяжджаць па вёсцы ў канцы лета, калі нітачкі прыгожага засмучэньня ўжо снуюцца нявідна і незлавіма ў цёплым паветры, ужо вяшчуюць восень?

Ціха ўсё, бязмоўна і бязьлюдна. Шэрым ціхамірным пылам пасьцелена пустая вуліца. На гародзе, за абціснутым плятнём схіліў на сонца жоўтую, з махрамі кружэлачку высокі сланешнік. Абсыпае чырвона-чорныя пялёстачкі добры мак, ужо запозны, і зьвініць дасьпелымі мачынкамі ў зубкавых карунках буйнейшымі і дробнымі, на тонкіх шызых сьцеблялінках.

Дзеці за доўгі дзень насеклі з макрыцы і крапівы сечанкі сьвіньням; споўзалі ў чужую рэпу і ў яблыкі; пакачалі кацёлку і няўмысьля пабілі ёю шыбу ў кутнікавым акне; паскрыгаталі, аглушаючы, калёскамі па вуліцы, возячы малога; пабіліся, улашчыліся; дапалі да паніклага сланешніку і неўзнаку выскублі паўкружэлачкі. Зрабілі з паловак мачын «лыжачкі» і будуць гуляць «у госьці»: натрусяць у прыпол запэцканых кашулек маку і пачнуць ім частавацца. А яшчэ будуць есьці госьцейкі «перапечы»—семя

праскурак, што густа парасьлі на вуліцы пад плотам і пад сьцяною разам з конскім шчаўлюком і сабачай мятаю.

Мляўкім і гострым нечым пояць каноплі паветра. Уссунуў дзед-даматур, што нічога няварты ні ў касе ні нават з граблямі, а пільнуе двору, дзяцей і пчол, уссунуў доўгую плашку на худыя, сагнутыя жыцьцём плечы ў дзіравенькім жупане і панёс яе па канаплянай сьцежцы на гумно—сушыць асець жыта, першую сёлетнюю асець. Гэты дзед—поэта ў душы і вельмі ўлюбіў пару году між лета і восені, калі надыходзіць пярэкрут у прыродзе на зіму, калі ўсё расьліннае даасьпявае, сыпле семя, дбаючы аб сваім жыцьці ў патомстве, і з ціхаю пакутаю ці-то пакораю спрадвечнаму закону жоўкне, схіляецца, ападае. Любіць дзедісьці аб гэтай пары па сьцежачцы сярод зялёнай пушчы канапелек, якія тхнуць сваім п'яным пахам і патроху прадзіраюць вочкі. Любіць любавацца на фарботы залаценькай павуціны, што бліскаюць на сонцы, цягнуцца, быццам плывуць і быццам сьцелюцца ад поля (дзе пажата і пусьцее), на гароды (дзе густа і поўна, а ўжо сьмягне і ўсыхае) і дальш на чорныя гоні (дзе незабавам зачырванее рунь). Любіць дзед, расклаўшы цяпло пад асецьцю і паплакаўшы ад елкага, з пахам прэлай гуменнай зямлі, дыму, доўга-доўга сядзець і бавіць час ля палыхаючых агнём плашак і грэць старыя косьці. Карціць старому пакласьці ў попел колькі бульбін і, углядаючыся на агонь-векавечнае, успамінаць, як быў маладым хлап-

цом (як цяпер ва ўнукі), пасьвіў коні ў позную пахмурную восень, клаў пад лесам з пасохлага вербалозу і бярозавых пянькоў вялічэзнае цяпло і пёк бульбу, а калі было сала, дык і сала прог на кіёчку, крутка падстаўляючы скібку хлеба, каб не сьцякаў дар на зямлю. Успамінае дзед, і часам глыне сьліну, але мае на думцы, што стар, і тады пільнуецца паважнасьці. Ат, усё роўна: нявестачка ніколі не забудзецца схаваць ключ ад клеці, дзе і сала таго толькі на затаўку для стравы. Як быў дзед у самай моцы, а жылі замажней, дык ужываў і ён уволю хлеба з салам, змалаціўшы да раньня асець жыта. Была пара! Але дзед—поэта ў ціхім сэрцы, і ня надта яму цяжкі раўнаваньні розных часоў свайго жыцьця; во, балазе, ёсьць печаная бульба і можна сядзець супакойна пад асецьцю каля агню і думаць аб жыцьці; і чакаць, калі палахлівы ўнучак затупае па таку босымі ножкамі, падбяжыць бліжэй і захныкае: «Дзед, а дзед! Ці ты тутацька?» Дзед памаўчыць, адылі ў часе пакашляе і, нібы сярдуючы, адгукнецца:—«Павошта, пыні, хлапчук-галуза прыбег?—пільнаваў-бы саду і боб ад кур, усе струкі зьдзяўбалі, гадаўкі». Тады здойме яго да сябе на спод і дасьць крупянай, сыпкай, белай і гарачай бульбачкі. І пачне бяз концу пераказваць унуку, як жыў ён, дзед, у пана пасэсара ў парабках, вазілі яны сала на продаж аж у Вязьму; у дарозе пяклі бульбу ды варылі кулеш пад чорнаю нявіднаю дзяругаю летняй ночкі дзе-небудзь на ўскрайку лесу.

Сонца борзда закоціцца, а дзеці ўздумалі «пірагі» пячы. Накапалі ў ямачцы гліны, у чарапочку замясілі і на ўслончыку наляпілі шмат вялікіх і маленькіх «пірагоў», на сонейку, дзе будуць яны пячыся. Дзяўчынкам прыкра, што ў бабскую справу ўбіўся хлопчык. Ён ня лепіць вялікіх і невялічкіх піражкоў, як тое вядзецца ў добрай гаспадыні, а пачынае галузавацъ, ляпіць ні-то конікаў, ні-то цюцек. І дзеўчаткі ўсякім спосабам чыста псуюць яму работу.

Ах, гэтыя перашкоды ў вольнай творчасьці поэты ў лепшую пару яго жыцьця, пару маленства!

Пара, на якую ня варта забывацца. Хто шчарствеў, пагінуў у будзёншчыне,—у дзіцячыя гады быў вялікім музыкаю, граючы на іскрыпачцы з лучынак і са струнамі з нітак. І даўлела яму, быў змысел і была радасьць. Хто зрабіўся тупы, як палка,—у гады маленства з палкі вырабляў мастацкія для яго мастацкіх пачуваньняў штукі: птушачак, зьвяроў і прост харошы кіёчак-папірашку. Надышлі гады жыцьцёвага амбарасу і бясконцага дурнога клопату— і зьнішчылі творчую радасьць, растапталі дыямант у пабітым шкле, з поэты зрабілі быдліну. Жыцьцё, жыцьцё! Мы ўсе прыходзім на сьвет хто песьняром, хто разьбяром, а хто і тым і сім патроху. Мы ўсе ў гады прачнаваньня нашага розуму—рэформатары нягоднага старога, будаўнікі лепшай соцыяльнасьці, славутыя настаўнікі ці добрыя разбойнікі, але часта-часта жыцьцё нічагусенькі не пакідае нам і робіць жаласнымі старцамі без пары.

Ці траплялася вам бываць на вёсцы ў гэткі час, калі пуста ў ёй пад пякучым сонейкам, усе людзі на полі сярод аўса і лёну, што жаўцее і галубее?

Ціха вясковая вуліца. Паснулі сланешнікі і макі. Аніводным пазалочаным лістком не варухнуць яблынкі ці сьліўкі. У гальлі і лісьці бялеюць і чырванеюць яблыкі, а пасьпелыя сьліўкі густа спляліся і віснуць, чорныя, да долу.

Ці здаралася вам у гэткі пагодны спаміж лета і восені дзянёк быць у вёсцы і трапіць на ўскрай хат, туды, дзе хацінка галяка ўехала ў зямлю, вокны яе з пабітымі шыбамі, запхнуты насьпех лахманамі і сядзяць на самай прызьбе?

Блізка хаткі тырчыць убогая вясковая верабінка з рэдкімі пучкамі чырвоных ягад. На верхавіну дрэўца зьвісае раскудлачаная ветрамі салома з стрэшкі. Комін напалову разбурыўся і скрануўся набок пад цяжарам шчарбатага гаршчка і рыхтуецца рассыпацца зусім.

Прадавілася на пуні стрэшка, і ніхто яе не падыме і не паправіць, як-бы няма каму паруліцца аб тым. Мо' ў шынку загуляўся гаспадар? А можа б'ецца, як тая рыбіна аб лёд, здабываючы штодзенны кавалак хлеба, але няма яму ўдачы! Прадраліся плятнёвыя сенцы, і скрозь іх відаць касыя дзьверы, падпёртыя знадворку карамысьлікам і таўкачом. Значыцца, нікога ў хаце няма. Але паглядзім... Калі вочы вашы паслабкі, калі яны, апрача свайго ўласнага адбітку і зялёнае цямноты, нічога ў акно ня ўбачаць,—вы ня

грэбуйце, ня бойцеся запэцкаць рукі і ўпіхніце лахманы. У дзірку бухне з хаты цяжкаватае смуроднае паветра. Адхіліце на хвілінку галаў і ўзноў зірніце: можа цяпер вам не ашукацца ў цемні шкла?

Што можна ўбачыць у хаце гаротнага мужыка-беларуса? Высокі, пад самыя абразы, стол, вузкі і хісткі; на ім—подаўна нямыты абрус, што зьбіты комам ці зьвісае ражком на лаву. Зірніце на пол. Не, гэта ня логава сьвіньні, ня птушатнік, куды садзяць кур ды гусак несьці яйкі.—Гэтая ўсклычаная канапляная сувалка і салома, гэты чорны ад бруду, зьбіты, сплямлены і сьмярдзючы сяньнік, гэты груд усякага шкумацьця, засыпанага сьмецьцем, з параю кінутых пялёнак; усё гэта—самая звычайная ложа для зманежанага працаю, спацелага мужыка, яго неахайнай жонкі і яго шалудзівых дзяцей. Чаго вам дзівіцца на закураныя шосьцікі і палічкі, дзе бабскія сховы? Нічога, апрача такога-ж самага рызьзя і сьмецьця, там ня ўбачым. Няцікава і старавечная наша бабулька-печ, аграмадная, са шчэрбамі ў чалесьніку, з выкрышаным загнетам і подам, з разварочаным пяколкам, наша на ўсе патрэбы адпаведная печ, паўнюткая гаршчкоў з ежаю, што пракісае на вячэру, і шырокіх донцаў, на якіх сохнуць добрыя баравікі на продаж і гнілое, чарвівае карэньне ў сваю капусту. Асела яна, старая, на струпехлых і паточаных шашалямі грубых балясінах, прыгнёўшы хваросьце ў падпечку і нейкія мётлы і гальні; і калі вы доўга прамучыце яе пад сваім урачлівым культурным поглядам, у якім нявера і крытыка,

дык яна, ох, ліханька!—загрыміць цэглай, і падавіць усё, што ў ей і пад ёю: хваросьце, і крупеню, і баравікі. Там, далей, у місачным куце тырчаць лапатачкі-лыжкі, нямытыя міскі і даёнкі, і ўсякі гломазд. Але ўсё гэта, калі не зважаць на чорны рой мух, усё гэта—няжывое, ня мае болю, і даўно прышла часіна шпурнуць адгэтуль многія рэчы, гаспадарнаю бабскаю рукою, за плот ці ў яму з-пад старога пограбу, што тры гады кідаюць у яе ўсякую дрэнь, і кладуць мяльле, а яна ўсё яма-ямаю.

А вы зірніце на жывое. Яно сярод хаты, на земляной падлозе, зьбітай у ямкі і залітай памыйкамі, сядзіць на кучы кійкоў і бляшанак, сядзіць, патурэцку падтуліўшы ногі, сядзіць ля місы, у якой рулі з пастаялкі, хлеба, мух і сьмяцьця. Круглыя дзіцячыя вочачкі, зарумзаныя і пахмурныя, з безнадзейным подзівам уталопяцца на вас. І патроху зьяўляецца сьвядомасьць: чаго вам трэба? Бо вы—ня маці, што зачыніла яго, ня маючы большых дзетак-нянек, і сышла на дзень-год у поле жаць авёс, сышла і ня ідзе пакарміць яго і абцерці носік. Вы разважаеце: хлопчык гэта ці дзяўчынка?—Ці ня ўсё роўна: доля-ж аднакава.

Гэта—герой нашае гісторыі Хомка.

Гэта—яго дзіцячая пара.

Безнадзейны подзіў пачынае паволі зьнікаць, даючы месца тужліваму расчараваньню: не, ня маці, а чужынец, незнаёмы, бязуважна пазірае на бяду малога. Пакутна ападае ручка, брудненькая і худзенькая, на якой толькі трошку-трошку цьмяна-жоўтай

дзіцячай пухласьці, і апяшала кідае лыжку ў міску з малаком. Адылі сьціскаецца ў кулачок, падносіцца да воч—і ўзноў бясконцае, роўнае, ужо аплаканае за доўгі дзень, галосіць гора:

— Гу-гу-гу... Ма-ма!..

Бязвыходнасьць страшная і пакора лёсу апошняя, крайняя—чуецца ў тым плачу, у тым восенным дажджы, у тэй музыцы бясьсільнага.

Гэта ўжо ня плач—гэта песьня роспачы...

І навучаюцца тэй песьні ў забытым краі яшчэ пад сэрцам матак. Яна снуецца тут вякамі. Яе шумяць тут панскія дубровы, гудзяць пяскі ў мужыцкім полі, жабы кумкаюць вясну і лета ў выгарах-балотах. Яе тут шэпчуць гнілыя стрэхі вясковых хат, скуголяць сьвіньні ўзімку ў дзіравым хлеве, рыкаюць вясною галодныя каровы. Яе крычыць тут кожны бацька, калі цягнецца з карчмы да хаты па калюгах ніколі непаладжанай дарогі, сярод абы-як, абы толькі, абы з рук, уробленых палёў.

І гэтую песьню бацькоў сваіх выплаквае цяпер тут перад вамі герой наш Хомка.

Вось узьняўся ён на крывых ножках пад мокрым падалом. Уздыхнуў глыбока, цяжка—і зноў прысеў.

Узяў кіёк і аглушона барабаніць па бляшанцы, што была калісь пад газу і што падаравала яе Малка Лэйзарыха яго маці за бабскія паслугі.

А пхэ! Няцікавае дзіця герой наш. Увесь у соплях, і нямыцька, і худы, а жывот—як той бубен: так выпнуўся ў дзіцяці ад пушнога хлеба і бульбы.

ГОРКАЯ ПРАМУДРАСЬЦЬ

1

З ВЯЛІКІМ ТРУДАМ кіруецца Хомка няцца кораню навукі. Дрэнна вучыцца Хомка. Даўно адабраў-бы ў яго кніжку і пратурыў-бы яго вон са школы настаўнік, каб ня дзіўная натура ў Хомчынага бацькі.

Асаблівы чалавек яго бацька. Ён усё маўчыць, як рыбіна, ён заўсёды нейкі хмуры. Ён і працавіты, як пчаліна; болей трывалага ў рабоце чалавека знайсьці цяжка, а мала ў яго ладу ў гаспадарцы, няма прыбытку. Узімку болей за ўсіх паставіць ён шурак у лесе; ён-жа і плотнік, і падзёньнік, але што заробіць, усё і пойдзе, як вада скрозь рэшата, нямаведама куды. Будынкі яго гніюць і валяцца, статак не вядзецца. І злосны-ж ён бывае часам страшна!

Уп'ецца—і шалее чалавек. Зазвычай ціхі, ён, упіўшыся, пярэ сваю нешчасьлівую жонку Домну мала ня досьмерці. Кідае з усяе сілы гаршчкі і міскі і кулаком, адным махам, крышыць вокны—толькі пасыплецца ды

зазьвініць... З дубцом у руцэ выходзіць сварыцца з кім-небудзь за свае крыўды.

— Юрка ўпіўся!—разьлягаецца вестка, і ўсе разьбягаюцца, бо нікому не даруе, у кожнага знойдзе грэх і да кожнага мае сваю прычэпку.

І настаўнік баіцца п'янага чалавека з дубцом.

Позна-позна, пасьля пакрову, прывёў Юрка свайго Хомку ў школу,—прывёў, калі скончыўся ў яго сына самы позны пастухоўскі і канюхоўскі тэрмін. Калі-б у гэтакую позную пару прывёў-бы свайго хлопца заможны гаспадар з гарнушкам масла ці капою яек, дык і яму бадай адмовіў-бы настаўнік. А Юрка прышоў без нічагутка, і ня канькаў, і не прасіў, а толькі стаяў панура ў школьным парозе. І настаўнік Хомку прыняў. «У часе наезду рэвізора буду выпраўляць яго дамоў, як быццам хворага», надумаўся настаўнік, з няпрыемнасьцю ўцякаючы ад Юркавых вачэй і маючы на ўспаміне чаргу хмельных выбрыкаў дзівака.

Наогул, у іхным родзе ўсе нейкія дзівакі. У вялікай злосьці яны могуць забіць свайго супарата. Дзед Хомчын смаліў жывую сьвінку... Доўга ганяўся ён па двары з даўбнёю і аніяк ня мог уцэліць, каб бэцнуць рухавай сьвінцы якраз за вухам, каб адразу асьвяжылася. А-ткі ён накінуў ёй на шыю пятлю з грубой вяроўкі, і, хоць скуголіла страшэнна, выцягнуў ён паланянку на канаплянішча, прыкруціў да каляка, глыбока ўбітага ў зямлю даўбнёю, і наваліў ўсю салому. І запаліў... Сьвіньня крычэла, плакала, шалела, ірвалася на дыбкі, ёрзала задкам па зямлі, возячы на сабе вя-

лікае вогнішча, урэшце, схапілася за каляк зубамі, як злы сабака. Дзікі сьвіны плач сабраў на тую камэдзь усё Асмолава... Вось які быў у Хомкі дзед.

Дрэнна вучыцца Хомка.

Зіма, сьцюжа, куты ў будынках покаюць ад лютага марозу. У невялічкай хатцы, аддадзенай паводле прыгавару грамады пад школу граматы, малюпаценькія шыбы ў вакенцах пазамярзалі на цэлую цалю, ажно маразяны хлоп вісіць. Хата цесьненькая; у ёй—аграмадная і нават пабяляная печ, шырокія палаці над усім полам, дзе часам начуюць, на воку ў настаўніка, пакінутыя ім за дуронства хлопцы. Толькі курчына—бэлька ад печы да супроцьлежнае сьцяны вешаць вопратку—толькі яна вынесена. У парозе на калодзе стаіць вядро з вадою; у вадзе іншым разам плаваюць ільдзінкі, што іх прыемна бывае схапіць у рот і смактаць, абпякаючыся холадам. Ля вядра—вялікая драўляная конаўка, пастаўленая пасьля таго, як пабілі настаўнікаў кубак. Вакол вядра, у парозе, дый скрозь—мокра і брудна, нанесена лапцямі і разьліта з вядра.

На печы, у кажуху, высунуўшы на хату з-за коміну галаву, з кніжкаю ў руцэ паварачваецца настаўнік. А за дзьвюма даўгімі партамі, на высокіх лаўках, сядзяць у кажушкох, сьвітках і жупанох, з шалікамі на шыі, толькі бяз шапак, вучні—хлапцоў з дваццатак. На асобным канцы, збоку, сядзіць некалькі дзяўчынак. Носікі пачырванелі, пара вылятае з роту. Другое аддзяленьне асьцягла плюе на грыфельніцы і шмаруе па іх рукавамі, высалуплівае з натугі языкі, пахіляе і

крывіць галовы, цісьне ад стараньня грудзьмі на парты і выводзіць дрыжачыя кіі і крывулі. Першае галосіць па лемантару:

— Б, л, а—бла! в, л, а—ўла! г, л, а—гла!

Трэцяе крычыць:

— Скворец известен всем! Скворец известен всем!

Дзяцём цесна, але затое цяплей. Ногі іхныя баўтаюцца, да парты ім ад лаўкі вельмі далёка («каб вачэй не сьляпілі», як тлумачыў настаўнік), а меншанькіх дзяцей і зусім з-за парты ня відаць, толькі тырчаць іхныя галоўкі.

Пасьля магутнага настаўніцкага покрыку: «Ці-іха!»—ад якога ажно мякіна сыплецца скрозь няшчыльную столь з вышак,—школа нямее. Адылі чутно слабенькае, першых дзён вясны, гудзеньне пчалінага вульля. Троху-патроху яно пераходзіць у шум, узьнімаецца вышэй, нагадвае гоман на вясельлі, далей вальную зборку ў Лугвенейскай валасьці і, нарэшце—вялізарны кірмаш... Усё вышэй-вышэй перакідаецца ў выцьцё, пяяньне, скогат самых страшных шалёных. На якія толькі ёсьць тоны і паўтоны, на розныя галасы і мэлёдыі скігочуць, скуголяць і гаркочуць, аж настаўнік усьмяхаецца троху з подзівам: як гэткае вясельле гукаў вылятае з малых грудак у кучачкі яго выхаванцаў.

— Га-га-га! Го-го-го! Гі-гі-гі! Б, л, а—бла! В, л, а—ўла! Скворец известен всем! Скворец известен!.. Известен всем!.. Всем!..

— Ці-і-іха!

Ізноў зьвіняць пчолы...

— Чарцяняты!—дабаўляе ціханька настаўнік і сьмяецца сам сабе.

А на вуліцы грымнулі балабонцы, з раскату астатні раз піскьява прастагналі палазы, і вазок палягчэў, калі з яго выбраўся нечаканы рэвізор, айцец благачынны.

Адчыняюцца дзьверы, лятуць лёгкія камы сьцюдзёнае пары, і ўвальваецца здаравенная, грубая і доўгаполая папоўская постаць. Спалоханы настаўнік кумільгам зьлятае з печы і кідаецца з далонямі падстаўленымі жменькаю, атрымаць блаславеньне. Але айцец рэвізор спачатку моліцца на абраз і тады ўжо бласлаўляе настаўніка. Настаўнік цалуе яму ў руку і асьцярожна-асьцярожна, баючыся сьмялей даткнуцца, сьцягвае з яго за рукаў хутру. Дзеці ня ўлучылі ўсхапіцца разам, як муштраваў іх загадзя, у сваім часе, настаўнік, і цяпер стараюцца кожны пасвойму паправіць бяду.

— Здрасьця! Здрасьця! Здрасьтвіця!—падпырхіваюць і выкрыківаюць па адным, зьбітыя з роўнавагі няўдачаю і страхам.

— Скворец известен всем...—апалым голасам ірве свой разгон адзін хлопчык, узьнімаючы галаву ад раптоўнай цішыні.

Калоцяцца дзіцячыя калені і тыхаюць сэрцайкі. Ціша...

— Ага, скворец известен всем... добре, добре!— хрыпатым басам кажа айцец благачынны, расчэсваю-

чы вялікім белым грабянцом свае доўгія валасы і памужыцку выбіраючы ільдзінкі з барады.—Добре, добре... ну, а ты, мой друг, бачыл скворушку? Тебе-то скворушка известен?—тыкае ён пальцам неўспадзеўкі якраз у нашага беднага Хомачку.

— Первагоднік гэта, ваша высокапрападобіе!—забягае наўперад устрывожаны настаўнік і з нянавідасьцю паглядае на свайго няўдалага вучня.

Хомка сапе, пазірае з-пад лобу і пачынае дрыжэць дробнай дрыготкай, як высілены конь у ваглоблях.

— Эх ты, брат, труса гоняеш... ня бойся, ня б'ю!—жартліва кажа яму рэвізор.—Ну-тка, этава да, што ты там чытаеш?—б, л, а—бла? Ну, прачытай-жа мне, мой друг, б-л-а—бла!

Яго друг нявыразьліва шэпча заўчонае «на зубок» бла вла, гла, ускабіўшы нявідушчыя тымчасам вочы ў бязьмерныя прасторы разгорнутае кніжкі, а дробныя капачкі поту ўсё гусьцеюць на яго пабялелым носе?

— Ну-тка, у разброд чытай! Ну, ну! Чаго-ж маўчыш? Ня бойся, ня б'ю, ну вот што гэта за буква за такая, этава да, ну?

А хто-ж яе ведае, што гэта за буквіна. Хомцы здаецца, што такой ён і ў вочы ніколі ня бачыў. Хомка з вялікім жахам праконваецца, што на тэй старонцы ў кнізе, якую ён можа без запіні адцерабіць напамяць, якую-ж ён неяк даўней чытаў, якую заўчыў ад таварышаў, што цяпер на тэй старонцы ўраздроб ён ні словейка не прачытае... Як гэта ста-

ласся, чаму так вышла, ён сам не разумее, і страх яму вялікі. І забіце яго цяпер,—ён ня вымавіць ні слова, будзе маўчаць і дрыжэць у пакорным, няўхільным, нямінучым страсе.

— Што-ж гэта такое?—з дакораю зьвяртаецца начальства да настаўніка.—Гм, што-ж гэта такое?

І ізноў прыступае да Хомкі, чэпіцца да яго, як смала, бярэ яго на мукі:

— Як тваё, братуля, імя?

— Хомка! Хомка!—падказвае нехта, шэпча, але ў Хомкі рот запячатаўся нясходанай нямотаю.

— Хомка ён!—раптам і бойка гаворыць адзін хлопчык, павесялеўшы, і бегае сваімі сьмяшлівымі бакулкамі.

— Ідзі-ка стань на калені!—ласкава кажа гэтаму хлопчыку благачынны, і сам настаўнік паслушна памагае пакаранаму вылезьці з-за парты і хутчэй выканаць загад.

— Ну, то як тваё братуля, імя?—яшчэ раз пытаецца благачынны ў Хомкі, але ўсё роўна адказу як няма, дык і няма.

— Ну, кажы мне, Фама, «Царю нябесный»!

Маўчыць Фама...

— Охо-хо-о!—уздыхае бацюшка.—Слухай, я табе прачытаю,—і кажа ўсю малітву ад пачатку да канца.—Ну, а цяпер ты, Фама!

Не, маўчыць Фама!

— І маліцца ты ня ўмееш, і чытаць ты ня ўмееш, і скворчыка ты ня бачыў... Скверна, брат, скверно!

— Пра скварца чытаюць у трэцім аддзяленьні, ваша высокапрападобіе!—адважваецца сказаць настаўнік.

— Нет, брат, скверно!—кажа яму ўзлаваны благачынны, а тады пытаецца ў Хомкі:

— А што такое шпак?

— Птушка...—ціха шэпча Хомка і весялее, і ўжо апынуўся думкаю ў цянёвым лесе, а дзе ўлетку шныхарацьу ляшчынавым гушчарніку шпакі і дразды.

І ўжо ізноў ня чуе пра што ў яго яшчэ пытаецца і што яму яшчэ тлумачыць страшны рэвізор.

— Ведай-жа, браце, што скварэц павашаму, папростаму і завецца шпак... Гэта і ёсьць той самы шпак,—чуе толькі нарэшце Хомка, бо айцец благачынны зьлёганька пстрыкае яму пры гэтых словах па носе.—Эх, і сам ты добры шпак!—кажа ён на Хомку і адступаецца да другіх вучняў.

Ну, а потым—пабыло і паехала начальства. Гукнуў узлаваны настаўнік Юрку і, быццам-то па загаду рэвізора, сказаў яму, сьвяткуючы вызваленьне, каб забіраў сына, а прывадзіў-бы яго, калі надумаецца, на налецьце, разам з усімі, без апазьненьня.

— Хомка Шпак! Хомка Шпак!—дражніліся цяпер дуроныя хлопчыкі з Хомкаю, адстаўленым ужо на гэты год ад школы і навукі.

Ну, нічога: падрасьце, паразумнее Хомка, дык можа лепей будзе ўчыцца хоць на другі год. Корань навукі горкі, затое плод яе салодкі...

2.

На слова «бірка» цяпер забываюцца, а даўней яго добра ведаў кожны няпісьменны аконам, войт ці лясьнік і кожны панскі падданы-мужык. Біркаю называецца палачка ці кавалачак шчэпкі з нарэзкамі, якія сьведчылі, хто колькі прывёз коп сена ў панскую сяніцу ці вазоў жыта ў панскае гумно, хто колькі вывез калод з лесу ці паставіў у лесе шурак. На самым пачатку цяперашняга веку бірка ў нашай старонцы блізу што зусім зьвялася. Яна баўталася яшчэ толькі пры кавалку сукна ў сукнавалцы, пры аўчынках у дубільніка ці пры бабскіх матках у Лугвенеўскага сінельніка Іршы, каб па ёй, па нарэзах, пазнаць, чыё сукно, аўчынкі ці маткі.

Можна ўважаць, з цяперашняга пункту гледжаньня, за пэўнае дзікунства выдумку новага асмолаўскага настаўніка завесьці бірку ў школе, але ён, сам родам асмолавец, былы унтэр-афіцэр, хадзіў падскокам, калі яму прышло гэта ў галаву, і ажыцьцёвіў свой плян з належнаю стараннасьцю.

Пёкшы бульбу ў позны піліпаўскі вечар, настаўнік, пры гарачым сьвятле, ад жару ў печы, выстругаў ножыкам брусочак з паўлокця ўдоўжкі і з палец угрубкі. На брусочку зрабіў ён дванаццаць нарэзаў і процi іх напісаў дванаццаць самых нялюбых яму слоў: «як, дык, хай, ці, ё, няма, трэба, добра, сёньня, учора, дабрыдзень, казаў».

Ураньні на другі дзень, як пачалі прыходзіць вучні, настаўнік стаяў ля дзьвярэй і чакаў.

— Дабрыдзень!—сказала акуратная лясьнікова дачушка, беленькая-беленькая дзяўчынка, вучаніца з трэцяга аддзяленьня.

Настаўнік нічога не адказаў і прапусьціў яе міма з пахаваным сьмехам.

Калі ўсе дзеці сабраліся, калі дзяжурны прачытаў «Цару нябесны», і ў клясе зрабілася ціха, настаўнік вышаў на самы пасяродак хаты, падняў бірку і сказаў гэткую прамову:

— Слухайце, дуб'ё! Як я ні ўчу вас гаварыць правільна і чыста, вы ўсё якаеце і дыкаеце. Во, прыкладам, Маша лясьнікова... Бацька яе пры панох часта бывае, у сьвеце быў, гаворыць, нішто сабе, і сам прасіў, каб я Машу навучыў-ткі гаварыць чыста. А тымчасам яна сёньня прышла і бухнула мне «дабрыдзень». Як трэба?—грозна падступіўся ён да зьбялелае ад страху лясьнікоўначкі.

Тая маўчала.

— Ну?!

У яе накруціліся сьлёзы, яна ўтупіла вочы. Уся кляса яшчэ болей сьціхла.

— Ну?!

— Мама папростаму гаворыць...—прашаптала Марылька і заплакала. Яна баялася, што за яе няўмельства гаварыць папанску настаўнік не дапусьціць яе да экзаменаў.

— Ах ты, дура паласатая!—сказаў на яе настаўнік.

— Слухайце-ж далей, дуб'ё!—ізноў зьвярнуўся ён да ўсіх дзяцей.—Вось вам будзе добрая цацка!—і пакруціў бірачку ў руках з усіх бакоў.—Пакуль што я вызначыў тут дванаццаць самых нягодных вашых слоў. Хто першы скажа ў клясе адно з гэтых слоў, таму даю бірку. Калі ён пачуе, што нехта яшчэ скажа якое-небудзь дрэннае слова, няхай таму аддасьць бірку. У каго бірка застанецца да абеду, той будзе пакінуты без абеду; у каго застанецца да канца дня, таго я пакіну сядзець у клясе да познага вечара. Зразумелі?

— Зразумелі!—вясёла адказалі бойкія хлопчыкі.

— Ну дык добра. Цяпер навучыцеся тых слоў, якіх трэба высьцерагацца. Для ўсіх аддзяленьняў тры словы: як, дык, хай. Скажыце ўсе па колькі разоў гэтыя словы. Ну!

— Як, дык, хай! Як, дык, хай!—зашумелі зацікаўленыя вучні і некаторыя нават сьмяяліся ад такое пацешнае забавы.—Як, дык, хай, якдыкхай, якдыкхай!.. якдыкхай—усё шпарчэй і галасьней чулася ў клясе. Адны хыкалі, быццам кашляе авечка, дыкх, дыкх, дыкх!.. Другія гаўкалі, як ганчакі ў лесе яўк, яўк, яўк!.. Трэція разагналіся на ўсю сілу, як тыя колы пад вагонамі на ўсёй хадзе цягніку: дыкхта, дыкхта, дыкхта!..

Настаўнік пагульваў сярод клясы з прыемнасьцю і ледзьва хаваў сьмех. І хлопцы раздурэліся.

— Зьмірна-а-а!

Усе змоўклі...

Тады настаўнік падышоў да першага аддзяленьня і спытаўся ў Хомкі:

— Ты бег, как заяц... Ну, скажы гэта самае па-правільнаму?

Настаўнік спадзяваўся пачуць жаданае «как». Хомка скокнуў з лаўкі, троху падумаў, ня ведаючы добра, чаго ад яго хочуць, а потым з некаторою няпэўнасьцю ў голасе, але даволі цьвёрда, адказаў:

— Ты бег, як заяц, гаспадзін вучыцель!

Усё трэцяе аддзяленьне і частка хлапцоў з другога зарагаталі. Настаўнік зморшчыўся.

— Ах ты ёлуп!—злаяў ён Хомку за яго адказ. Паглядзеў на яго з глыбокаю пагардаю і непрызьню і ізноў спытаўся:—Ну, якія простыя словы забараняюцца ў вашым аддзяленьні? Пералічы, га?

Цярпліва і доўга чакаў настаўнік адказу ад Хомкі, а Хомка з ня меншаю цярплівасьцю і цьвёрдасьцю маўчаў. Настаўнік пакруціў яго крыху за вуха і кінуў.

— Ну, ты?—зьвярнуўся ён з тым-жа пытаньнем да Марылькі-лясьнічанкі.

— Як здыхаў,—адказала Марылька. Была яна страшэнна затуканая дзяўчынка і зусім атупела.

Цяпер ужо ўся кляса зарагатала, і мімаволі сам Хомка пасьміхнуўся, зараз пасьпяшыўшы ізноў дзеля гадзіся нахмарыцца.

Калі троху сьціхла, настаўнік абвёў вачыма дзяцей, і шмат рук пад яго пытлівым поглядам узьнялося ўгору ў знак веданьня. Але настаўнік ня пытаўся. Ён паклікаў колькі хлапцоў з трэцяга аддзяленьня і даручыў ім навучыць першагоднікаў тых слоў, якіх ня трэба казаць, каб не схапіць біркі ў рукі, а сам заняўся з тэю-ж мэтаю з другім аддзяленьнем. Бірку аддаў, для пачатку, беднай Марыльцы за «дабрыдзень».

*

О, бірка, бірка! Колькі за цябе пралілося горкіх дзіцячых сьлёз, колькі выдзерта хахлоў, пабіта рук лінейкаю, намулена бедных каленяў, і колькі пасварылася самых блізенькіх сяброў! Здаецца, так усе стараліся гаварыць паправільнаму, але кожны дзянёчак у нечыіх руках заставалася «дудка», як з горкім сьмехам празвалі бірку школьнікі. Кожны хацеў сьпіхнуць яе з сваіх рук, і часта ішлі нават на подлую зраду, або, як цяпер кажуць, на провокацыю. Дастаўшы ў рукі бірку, зраднік заклікаў у куток таварыша і наўмысьля пачынаў размаўляць зусім бяз панскіх слоў. Не пасьпяваў той, ня сьцяміўшы сказаць «добра» ці «нічога», як зраднік радасна крычаў: «Ага! Маеш бірку! Ты сказаў «нічога», а паправільнаму трэба казаць нічыво». І ў руках прастака ўжо тырчэла бірка. Асабліва здацен быў на гэтыя штукі Лявонька Задума. Дзеля таго што ён шмат чытаў

расійскіх кніжачак, якія бацька купляў яму на кірмашох, ён рэдка меў у руках бірку і ўмеў лёгка ад яе адчапіцца. Часта нават для забавы ўводзіў ён у спакусу тых сваіх таварышоў, якія старанна вучыліся панскае мовы, старанна адвыкалі ад мужыцкай, але ніяк не маглі адвыкнуць. Дастаўшы наўмысьля бірку, ён туляўся і падслухваў, як размаўляюць гэтыя «паны» (так звалі іх у школе), а рабіў гэта дзеля таго, каб аддаць бірку на канец заняткаў самаму заяддламу «пану», каб настаўнік пакінуў яго з біркаю сядзець у школе да цёмнага.

І хто-б мог разьлічаць, што бірка згіне гэтак сама неўспадзеўкі, як і звалілася на бедныя дзіцячыя вучнёўскія галовы; што канец яе будзе няслаўны, а для настаўніка нават дужа прыкры?..

Найбольш цярпеў ад біркі Хомка Шпак. Выпадалі такія дні, калі бірка ня выходзіла ў яго з рук. Хомка зрабіўся папіхачом нават першагоднікаў, асабліва тых, чые бацькі пабывалі ў сьвеце, а гэта значыць—самых свавольных дзетак. Нават Лявонька калькі разоў усунуў Хомцы дзеля сьмеху праклятую бірку, пакуль не пераверыўся, што сьмеху ў гэтай справе мала, бо Хомка горка-горка плакаў, што ўжо і Лявонька яго пакрыўдзіў. Што-ж ня кожнаму так, як Лявоньцы, могуць прывазіць з кірмашу кніжачкі з размалёванымі дужа прыгожа, у розныя колеры, вокладкамі. Вучнёўскі натаўп разумець гэтага не хацеў і сваім рогатам патураў настаўнікавай выдумцы, калі бедны Хомка стаяў ля печы на каленях з біркаю

ў руках, як пабожны пан у касьцеле з сьвечкаю. Хомка быў адзін з сваім горам, і сэрца яго краілася ад крыўды й жалю. Бацька ў хаце—і той крычэў на яго, што дрэнна вучыцца... Каб яны самі ведалі каб яны самі спрабавалі, як гэта лёгка наўчыцца гаварыць папанску! Толькі адзін абраз, не спагадны, не, але разумны, стаяў уваччу Хомцы ў часе яго пакут. Гэта быў абраз старога дзядзькі Тамаша, які на зборках зазвычай маўчаў, але меў сваю асобную ад усіхнае думку, калючую і дасьціпную. Усе мужыкі ведалі, што настаўнік-жа павінен выбіваць з вучняў простую мову і ўсё дурное,—на тое-ж ён і настаўнік. І толькі дзядзька Тамаш, стоячы збоку, пыхкаючы сваю ўбогую піпку і раз-па-разу плюючы, толькі ён адзін першы здагадаўся сказаць—ці-то пра настаўніка, ці-то пра яго навуку: «Ат! Ня дай бог сьвіньні рог, а хамуйле панства». І хоць за ім першым і другія пачалі наракаць на унтэр-афіцэра за яго «сьвецкі форс» і «дужа ўжо панскую мову», але толькі Тамашовы дзядзькавы словы мёдам ляглі на сэрцы ў Хомкі. Настаўнік і ня любіў Хомку за тое, што Хомка ніякім чынам не хацеў прызнаваць ні таго форсу, ні тае далікатнасьці ў размове—быў самы мужыцкі паростак з самага дурнога мужыцкага карэньня. А Хомка ня любіў унтэр-афіцэра за яго бліскучыя боты, за яго чырвоныя наплечнікі і жоўтыя гузікі на чорным мундзіры, за яго панскае ламаньне языка—і чырванеў, калі мусіў казаць, як і настаўнік, «как», а ня «як»...

На тым грунце і адбыўся бунт, пасьля якога пагінула бірка.

Пачалося з драбніцы.

— Да сьвіданьня!—казалі вучні, ідучы дамоў. І ў сваім рухавым грудку жартавалі: «Да сьвістаньня! Да сьняданьня!»

Таго дуронства унтэр-афіцэр ня чуў. Але Хомка ці-то жартам, ці-то здуру бракнуў, троху астаўшыся пад самым настаўніцкім носам:

— Да сьняданьня, гаспадзін вучыцель!

— Застанешся да цёмнага!—схапіў яго настаўнік;—бяры бірку!

— За што? Я ні ў чым не абмыліўся!—захныкаў спалоханы Хомка. Вучні прыстоілі.

— Ну, ідзі ды болей ня дурэй!—наўзьдзіў зьмякчыўся унтэр-афіцэр гэтым разам і пусьціў Хомку.

Як на тое ліха, быццам чорт улез у хлопца. Ён выскачыў з таварышамі з падворку на вуліцу, забыўся аддаць бірку, і тут прыставіў яе сабе старчма да лобу, скрывіўся, дужа ёмка ўдаўшы унтэр-афіцэра, і сказаў, як дзядзька Тамаш:

— Ня дай бог сьвіньні рог, а хамуйле панства!

А ня ўгледзіў бедны, што ня ў клясе быў настаўнік, а вышаў сьледам паглядзець, як будуць яны разыходзіцца. Пабачыўшы, як дражніцца нялюбы яму вучань, ён счырванеў аж на каліну, раптам рынуўся да Хомкі і даў яму ў каршэнь. Хомка зарыўся носам у сьнег.

— Давай кніжкі! Давай кніжкі!—хрыпеў настаўнік і выдзіраў кніжкі з яго апэцканай торбачкі.

Адабраньне кніжак азначала тут, што дзьверы ў навуку назаўсёды зачыняюцца. Калі аб кім казалі: «Настаўнік адабраў у яго кніжкі», гэта азначала, што нешчасьлівага пратурылі са школы без павароту.

Хомка, як скрозь туман, зразумеў, у якую вялікую бяду, сорам ад людзей і страх ад бацькі ён так неспадзявана трапіў. Сэрца яго зашлося... І тут Хомка быццам здурнеў—першы раз у жыцьці сваім...

Ён усхапіўся з сьнегу на ногі, паставіў бірку якраз пасярод, на паднятае калена—і з шалёнай, як у бацькі, злосьцю—рраз!—пераламіў яе... Раскінуў канцы ў розныя бакі і паглядзеў, нічога ня бачачы. Аж ізноў кінуўся і падхапіў адзін адломаны кавалак біркі, пачаў ламаць рукамі, а дробныя кавалачкі—нават памог зубамі; патрышчыў-патрышчыў—і кінуў, спакайней і пагаспадарскаму, у той бок, дзе пад страхою, ля пуні, ляжалі дровы.

Усе скамянелі. Сам настаўнік ня ведаў што сказаць.

А Хомка заплакаў гаручымі сьлязьмі і паплёўся дамоў з пустою, бяз кніжак, торбачкаю, аддаліўшыся ад усіх вучняў, якія таксама засмуціліся і ня ведалі, чым яго добрым пацешыць.

ШКОЛА ЖЫЦЬЦЯ

1

У РОДЗЕ ГЕРОЯ нашае гісторыі было колькі, ад бацькі-дзеда і далёка-далёка ўгару, слаўных выпівак; былі аж, на свой лад, знамянітасьці ў тэй справе, слаўныя на далёкую мужыцкую ваколіцу—значыцца, вёрст на дзесяць і на пятнаццаць па радыусу, да тых межаў, за якімі разьлягалася слава сваіх ужо для тэй сумежнай ваколіцы знамянітасьцяй.

Дык, мусіць, выродкам, на просты погляд, удаўся герой нашае гісторыі, бо на погляд людзей наўчоных такія прыпадкі бываюць. Ён душыцца (праўда яшчэ малы, не прызвычаены), ён прост душыцца ад гарэлачнага паху. Ён мімаволі ад галавы да ног ня раз здрыгнецца, як у трасцы, калі стаіць сярод сьпіртовых вазакоў, ля броварнага складу, і калі ў паражняковых, якім ужо заплочана, сьмярдзіць з роту, як з самае паганае бочкі.

О, гэтыя жалезныя сьпірытусовыя бочкі! Маленькі Хомачка чуе сьмярдзючае душэньне ў глотцы ня толькі тады, калі хоць у думцы бачыць іх,—ня надта-ж і

сьмярдзіць ад іх, а калі запячатаныя, дык і зусім нічога не сьмярдзіць,—не, яму робіцца мляўка і цесна ад тых ужо гамонак, што «ў суботу ізноў павязуць на станцыю сьпірт». Мляўка ад паху п'яных, цесна ад бочкі на маленькіх, голых і сьцюдзёных санках. З якога боку ні прыткніся—бочка разьляглася шырока, як карова, цяжка і няўважна, як калода.

Закапцелі чырвоныя мураваныя сьцены бровару,—круглы год, зіму і лета, а найболей, аднак, узімку копціць у паветры вялізны, высачэзны, закураны і з цікавым чорным драцяным калпачком цагляны комін. Гоняць там гарэлку з бульбы й жыта.

Спацькі-б дый спацькі пад цёплым кажухом, а трэба ехаць разам з бацькам, трэба цёпла абувацца, апранацца ды ісьці на сьцюжу дый садзіцца на чужыя сані (на сваіх, горшых, едзе бацька сам).

Да бровару ад хаты блізка, і сьцюжа, хоць дужа прыкрая малому пасьля цёплай хаты, ня доўга цягнецца, каля бровару можна пагрэцца.

Тады—бровар. Шум, лаянка. Пояць коні. Яму трэба іх трымаць, пакуль бацька з мужчынамі ўскоціць па дошках на кожныя санкі па бочцы.

А потым ехаць—далёка, нудна, у страшэнным холадзе...

Маўчыць на пярэдніх санёх бацька. Баіцца, каб не астацца ці незаехаць як-небудзь дрэнна, хлопчык. І так бывае часта-часта... І ў мароз, і ў замятуху...

Сядзі ў сьцюдзёных поцемках ля праклятай з двума рагатымі абручамі бочкі, што пячэцца, як агонь, сваім марозным жалезам, калі ня хочучы даткнешся да яе. Вялікая, грубая—расьпірае ўсе санкі.

— «Скрып-скрып... скрып-скрып-скрып... чжыкжыжы-шшш... гоп-чык!.. скрып-скрып»...—пішчаць на сьнезе прыдаўленыя бочкаю палазы. Шкода каня, хоць і чужы,—цяжка яму. А свае кабылы—яшчэ жалчэй: яна-ж слабейшая, і баіцца яна бацькавага пугаўя па вачу, як Хомачка баіцца яго крыку й балючай пугі.

— Гэй ты, варона! не зявай!—крычыць на яго нехта, абганяючы; вязе двух у чорным—паноў ці гандляроў.

А зусім цёмна, і сьнег сыплецца ў вочы.

— Не засьні!—крычыць і бацька сьпераду.— Зьлезь, прабяжы, ну!

Хлопчык выскаквае з санак і бяжыць ля іх збоку, не трапляючы, топячыся ў кучках сьнегу. А ззаду бегчы—баіцца астацца.

— Ну, тут гладзенька: паедзем шыбчэй!—ізноў чуваць бацькаў голас.

Коні пабеглі. Хомка доўга ня можа аддыхацца, патроху адпачывае, прытуліўшыся ў перадку саней да пучка тырчастае саломкі.

Сьнягавая бягучая дарога ўцякае, бы нейкі бягучы паласаты змрок уваччу; уцякае з-пад саней, з-пад вока назад, туды, дзе бярозавыя прысады і нейкія

кусты бела-засьнежыліся з усіх бакоў і зьліваюцца з шэраньню ночы.

Ён ня сьпіць, а толькі дрэмле, але сьніцца яму нешта такое-ж цёплае, слаўнае...

*

Вось прывялі яны,—вярзецца яму,--пасьвіць коні ў Боцікі. (Так празвалі ў іх балота, за тое што выходзячы з яго кожны меў на нагах чорныя боцікі з гразі, як з лепшае гамбурскае скуры). Вось саскочыў ён з кабылы, добрай кабылы, што-ткі разжыліся і купілі яе, на кірмашы на праводніку ў Горадзе. Трэба-ж яе добранька, прыгожанька спутаць. А яна махае ад зыку хвастом, як ачмурэлая, проста сячэ яму ў вочы і па шыі, б'е сябе нагамі пад бруха, дзе смалою ліпнуць вялікія сьмелыя авадні і дробненькія, ды ўедлівыя, злыя мушкі. Кусаюць аж да крыві. Сьцёбае кабыла па бакох і пад ногі хвастом, вось балюча сьцебанула і яго, кончыкам хвосту, па саменькаму-ж вуху,—не стаіць ніяк, няможна яе спутаць.—«Гэй ты, варона! Ня сьпі, зьмерзьнеш!»—крычыць нехта абмінаючы. А нікога няма, толькі здаецца.—«Не, ня зьмерзну»,—шэпча ў адказ ці-то сабе, ці-то няведама каму.—«Нагу! Нагу! каб ты здохла!..»—крычыць ён на кабылу, сагнуўшыся і баючыся, каб яна ня ўдарыла яго няўмысьля капытом, і цягне за пута адну спутаную нагу да другой, яшчэ простай нагі. А пута аніяк-жа не даходзіць, бо не стаіць кабыла. Неткі,

удалося зашпіліць пута...—«Ваўкарэзіна!—закрычэў ён, як крычыць на яе бацька;—у балота! нэ-э!»—і турыў яе ў самую патапечу. І ўсе хлопчыкі, зьвязаўшы аброці ў пукі, гналі коняй у балота аж да купніку з высокаю маладою асакою. Коні скубуць там яе, вязнучы па самае бруха. Нікуды яны адгэтуль не ўцякуць, панскі лес і ўсякая шкода адгэтуль далёка, дык сьмела можна справіцца схадзіць у ракі... Пайшлі ў ракі, а цёплае паветра абдавала проці ветрыку, быццам першым душком у лазьні. Краскі—белы рамон, мякенькая ліпкая смолка, нават жоўты казелец—быццам пасьмяглі пад сонцам і толькі зрэдку пакорна калыхаліся пад тым гарачым абдаваньнем ды ізноў ніклі ад мляўкае зьнямогі ў такі гарачы дзень. Конікі, ці як іначай завуць іх—кавалі, і яшчэ нейкія скакунцы бяз концу зьвінелі, зьвінелі і тоненька бразгацелі сваім нябачным рассыпаным хорам, быццам многа слабых бразкучых кос пад кляпцом на бабцы ў касцоў. Ракіты і альшэўнік, а і пагатоў таго, ніцы лазьнік туліліся ніжэй з берагу да вады, цёплай і ленаватай у закруцістай Плёсцы. Хлопчыкі адбеглі далёка ад Боцікаў, аж пад самыя віркі, дзе ў пячурах, пад карчамі, сядзелі, пахаваўшыся ў холадзе, старыя ракі. Беглі хлопчыкі навыперадкі, а ўгледзеўшы вірок, з якога была рада пачынаць, паддалі духу ў бягні. Бягучы расшпільваліся, расьпяразваліся і зьдзявалі кашулі. Хомка троху астаўся. Яму, прызнацца, было страшнавата лавіць ракі, бо яго напалохаў бацька, што з пячуры, замест рака, можна выцягнуць сьлізкую

вужаку, а яна ўкусіць—і можна памерці. Ды ўсе лавілі ракі, і цікава іх лавіць: запусьціўшы голую руку, гэтак па шыю, у сьцюдзёную, у пячурах яшчэ сьцюдзянейшую ваду, пад самае альховае карэньне, зашчупваць у каравым карчэўі ў пячурцы, у зямлі, каравага, цьвярдога, старага рака, схапіць яго за броню, каб ня сьціснуў пальца кляшнёю, і цягнуць... выхапіць з вады і кінуць на бераг, на траву-мураву, дзе рак будзе шавяліцца і паўзьці. І Хомка разьдзеўся і зьвязаў кашулю і штаны паяском у камочак, паклаў ля сябе з аброцяю і сеў на беразе. Ногі спусьціў у ваду, каб патрошку абыйшліся ў халодненькім. Сьцюдзенавата левай назе... З-пад пазухі тхне, трошку трошку чутным, але войстрым пахам поту; гарачае паветра аблівае цела, з маленькаю радзімаю плямкаю на баку, аблівае сваім непякучым цяпер павевам, авадзень гудзіць дый цікуе сесьці хлопчыку на голую сьпіну. Нагам так добранька, ды нешта ўсё халадней і халадней, чым усяму целу. Вось зараз ён кінецца ў ваду і паплывае...

— Ня сьпі ты, дурань!—крыкнуў бацька і балюча таргануў:—ці зьмерзнуць хочаш?—і выкінуў яго адным махам з санак.—Прабяжы троху, зараз абагрэемся ў заезьдзе.

*

Чорныя будынкі высоўваюцца з шэрай і сьнежнай начавой плямы,—як добра, што ўжо прыехалі сюды, дваццаць вёрст уехалі, а цяпер, мусіць, толькі першыя

певні прапяялі на куросаднях пад страхою. На вуліцы гэтага ці-то малога мясьцечка, ці-то выселак з капліцаю, манаполькаю, крамаю і заездам, на вуліцы тут цяпер ціха, сонна і сьнежна; толькі ў хаце заезнага двору яшчэ відаць слабенькае сьвятло скрозь замерзлыя, чырвона-бліскучыя, нязвычайна прыгожыя, дзіўныя шыбы; на падворку яшчэ тупаюць коні, скрыпаюць санкі, і чуваць прастуджаныя мужыцкія галасы. Але вароты і надворныя дзьверы—усё зачынена, замкнута, бо позная пара, позны вечар, ноч.

Хата ў заезным двары падзелена: у чыстай палавіцы жывуць гаспадары, у чорнай—начуюць возьнікі. З чыстае каморы далятае аднатонна і далікатна дрыжачы голас старэнькага законьніка, у якога вялікая беленькая барада, шырокая да плеч і даўгая на ўсе грудзі. На дробненькай у параўнаньні з барадою, галоўцы сядзіць чорная шапачка-ярмолка. Стары моліцца богу. Ён і бубніць, і плача, вые, і гаркочыць, і енчыць, і пяе, і жаліцца, і сварыцца... Толькі сам грозны Егава, бог юдзейскі, можа разабрацца ўва ўсіх пералівах гэтай гарачай, ярай і жудаснай малітвы. А з чорнай палавіцы ў чыстую, з чыстай у чорную, адтуль сюды і ізноў назад ходзіць гаспадыня—старая і таўстая, неахайная, нязвычайна цярплівая сэмітка, жонка таго далікатненькага, чысьценькага, белабародзенькага дзядулі. Яна супроць яго—маладая, бо трэцяя ці чацьвёртая, здаецца, у яго па ліку. Ходзіць з ключамі пры поясе, бразгае, мякка, аднак, ступаючы валенцамі па радняных посьцілках-дарожках у чыстай

палавіцы. Калі стары багамаленьнік троху сьціхае, тады байчэй цікае ціхі гадзіньнік на сьцяне, і цяжка сапіць за драўлянаю пераборкаю, закапаўшыся ў кучу пярын і падушак, маладая пара—зяць і дачка старых. У старых—дзяцей бяз ліку, але ўсе яны рассыпаліся па ўсіх краёх, блізкіх і далёкіх, знайшоўшы хто лепшую, хто горшую долю: музыканта, каваля, дантыста, крамніка, студэнткі, капялюшніцы... І жывуць старыя ў сваім доме толькі з аднэй гэтаю дачкою і зяцем прымаком. Зяць—бойкі чорнабародзенькі чалавек, які пакуль што жыве ў цесьця і займаецца абы-чым, нават стаіць над кароваю, калі яна п'е пойла, але ён пэўны ў сваіх здольнасьцях, і цьвёрда ведае, што будзе багацейшы за свайго бацьку, і дзеда, і прадзеда і будзе мець капіталу на сотню гэтакіх кароў. За другою пераборкаю, дзікае і грубое стварэньне батрачка Матруна, калыша дзіця маладой пары. Калыша і ўвесь час бурчыць, як злосны сабака над косткаю: усіх яна груба лае, усіх, і дзіця нават, груба кляне, на ўсіх і на ўсё груба бурчыць... У чорнай-жа хаце, на лаўках, па застольлю, на печы і на запечку, на падлозе, загарадзіўшы старой гаспадыні праход, ляжаць у сваіх цяжкіх і з прэлым духам, як ад мокрага надвор'я вопратках, сярод розных лахманоў, збруі, торбаў і хамутоў, ляжаць мужыкі-возьнікі. Найбольш тут сьпіртавозаў, але ёсьць і што вязуць пяньку ці лён, красны тавар ці бочку селядцоў. Сапуць і хрыпяць, спрасонку цмокаюць і балмочуць, паганяюць ува сьне коняй і лаюць нямаведама каго. Два чала-

векі разьляглісся на голым засьмечаным стале, на селядцовых хрыбніцках і крошках хлеба. А каля іхных ног у вялікіх лапцёх селі-прымасьціліся таксама двое, гэта спозьненыя: слабенькі дзед і здаровы, мурласты і шырокі ў плячох, яго пляменьнік-хлопец; не хапаючыся, а са сьціплай, павольнай паважнасьцю, як усе сяляне, ядуць яны селядца з хлебам, дастаючы той хлеб раз па-разу з торбы, адкрайваючы па скібцы і ізноў хаваючы краец у торбу. У парозе-ж, у даўгую, настаўленую ў комін, чорную бляшаную трубу грымеў-грымеў, пыхаў-пыхаў і супакоіўся-ткі нанач, не прычакаўшы новых начлежнікаў, запэцканы, пузаты самавар.

Так позна, што ўжо нікога болей да самага сьвету можна не спадзявацца.

Аж не: шумяць на вуліцы сані, шаруюць па сьнезе і заціхаюць ля варот. Сталі... Пахадзіўшы там ля коняй, ля варот, тупае чалавек на ганку і потым стукаецца ў дзьверы: тук-тук-тук!

— Во, ты казаў: дужа позна! Яшчэ некага і пасьля нас бог нясе,—гаворыць спакойна пляменьніку ціхенькі дзядок, абціраючы рукі ад селядцовага соку аб анучы на нагах.

А знадворку ўжо: ту-ду-ду-ду-у!..—дужэй. І глуха чуваць пазяблы голас:

— Адчыніце! Адчыніце!

Шлёпае гаспадыня з чыстае каморы бліжэй да чорнае хаты, але ня выходзіць, бо мусіць, ужо яна разьдзеўшыся, і шукае чалядку;

— Матруна! А, Матруна! Ці ты гэта аглухла?

— А яна сабе сьпіць, закалыхаўшы бахура, дый нічагусенькі!—кажа возьнік-дзед, ня зірнуўшы на пераборку.

Затое туды паглядзеў яго пляменьнік-хлопец.

— Матруна!!—крычыць ён раптам, як у полі...

— Ой, як ты крычыш! Ой, як ты крычыш!—гневаецца гаспадыня замест падзякі за помач.—Ай ты думаеш, хлопец, што ты ў стадоле? Усіх узбудзіш сваёю дурную трубою, а нашто?.. Матруна, Матрунка! Ну дос табе ўжо ня чуць, пачуй ты ўжо хоць раз ды ідзі пытайся, хто там лезе, ну!

З неахвотаю выпаўзае касалапая Матруна з-за свае дашчатае пераборкі. Сонна пацягваецца, чэша сьцягно, пасьля карак, а тады праціране свае буркалы і кляне:

— А мамачкі! Усю ночачку едуць а едуць, каб яны жыватом паехалі. Дню з іх мала, каб ім яго даў бог ня прыждаць болей ніводнага...

А-ткі пайшла.

Скрозь хатнія дзьверы далятае з холаду, з сенцаў, размова. Гамоняць з абодвух бакоў зачыненых надворных дзьвярэй. Матруна сварыцца, каб спагнаць злосьць, што яе патурбавалі со-сну:

— А хвароба на вашу галаву!—крычыць яна, а што кажа там той за дзьвярмі, няможна разабраць за яе голасам.—Прышоў на вас чорны год! Сьпі-і-ірт? Хадзяйка сёроўна ня пусьця! Што? А дзе хоця! На вуліцы, дык і на вуліцы... Было ня браць малога, а

мне што? Ды кажу-ж табе, што ўжо няма куды... поўна вас чарцей-д'ябалаў! А мамачкі, во прыліп, як смала да Піліпа. Пайду спытаюся ў хадзяйкі...

— Матруна!—гневаецца гаспадыня:—каб ты ўжо там анямела. Што ты там гамоніш, ой, што ты там гамоніш?

Матруна варочаецца назад.

— Два вазы з сьпіртам,—рэфэруе яна гаспадыні, няхораша скоблячы то зад, то перад:—хлопчык там акалеў ці што: на прамілы бог просяцца.

— Кудой я іх пушчу?! Хай едуць у Слабодку.

— Ну, Пэся,—уступаецца возьнік-дзед,—як-то ня пусьціць чалавека? Не вялікія мы паны, зьмесьцімся, а плоха-то яму яшчэ на Слабодку валачыся, калі хлопчык акалеў.

— Ты здурнеў, стары! Кудой-жа ж я іх пушчу?—гневаецца гаспадыня, а тым часам знадворку ізноў пачалося: ту-ду-ду-ду-у!

А дзіця за пераборкаю варушыцца ў сваіх пялюшках ад гоману.

— Ой, божа мой!—стогне гаспадыня,—ой, божа мой! Матрунка! Ідзі ты пратуры іх ад нашае хаты! каб ня тлумілі галаву... ці ўжо—пусьці ты ўжо іх, пусьці ты ўжо іх!

І цераз нейкі час бэхае аб сьцяну завал, сані скрыпаюць на падворку. А яшчэ цераз нейкі час паказваецца ў дзьвярох камок лахманоў—хлопчык, а сьледам за ім, з мёрзлымі вусмі і барадою, запарошаны сьнегам—бацька.

— Добры вечар! Хлеб ды соль!—кажа ён.

— Добрае здароўе! Хадзіце вячэрацъ!—адказвае дзядок.

— Вячэрайце на здароўе!—канчае прынятыя звычаем прывітаньні бацька.

— Авёс брацъ будзеш?—падступаеццa зараз Пэся.

— Свайго трохі ёсьцъ... Сена хунтаў дзесяцъ дай,—трэба-ж табе зарабіцъ.

— Зарабіцъ?.. З вас заробіш... А селядцоў?

— Не, якія там селядцы: ці мы не вячэраўшы паехалі, ці што? А во сотку, калі маеш, дай—пагрэццa.

Гаспадыня дае сотку і ідзе спацъ. Матруна ўжо даўно схавалася. Толькі дзед яшчэ мусіцъ распытаццa: хто, адкуль, што вязуцъ і чаму так позна? І свае справы дзед, хоцъ каротка, але пераказвае, бо як-жа не сказацъ чалавеку, не пагаманіцъ з ім? Ды вось, што трэба—сказана, і пара спацъ. За паўгадзіны ўсё сьціхае. Ня моліццa старэнькі законьнік, ня кугакае малое...

Толькі акалелы герой наш, перастаўшы-ткі дрыжэцъ, даволі часта, аднак, кашляе на печы, кашляюцъ патроху і другія возьнікі, а на сьцяне, пад самай стольлю бойка цікае гадзіньнік, хоцъ старэнькі і ціхі, а цяпер такі звонкі: цік-цік! цік-цік!—і аж у ім зьвініцъ. Сьмярдзючая капцёлка ледзь асьвятляе сваім маркотным гарывам яго рагаты цыфэрблят, некалі беленькі з зялёнымі красачкамі. Сьпяцъ...

2

Сьпіць хлопчык, як забіты, і кашляць перастаў. Вярзуцца яму сны ўсякія. Сьніцца яму, сьніцца яму, што сьпіць ён у сваёй хаце, на палу ля сьценкі. Прачнуўся ён удосьвецьця, уздыхнуў і расплюснуў вочы. Агледзіўся і прыслухаўся, лежачы ціхенька ў цёпленькім. Сьветач вісіць на шосьце ля полу. Лучына гарыць невясёла, як заўсёды. Угару ідзе ад яе палавы дым. Часам яна дыміць, часам дужа разгарыцца, часам стужачкаю жоўтаю ўбок пяе пра зіму, пра маркоту: джжж... На мост валіцца чорнае вугальле. Адтуль, дзе гарыць лучынка, цягне цяплом у сьцюдзёнай, сумнай хаце. Ціха. Матка сядзіць на палу і маўкліва прадзе, толькі верацяно трынкае. На калодцы сярод хаты сядзіць бацька; дастае з чугуна, з цёплай вады кружкі лык, раскручвае іх на руку ў другі бок і кроіць, адкідаючы тонкія, даўгія акраўкі, з якіх малыя дзеці плятуць лапці, каб навучыцца плесьці, ня псуючы добрых лык. «Кату лапці», скажа нязюклівы бацька на тое няўмельства. Паправіць матка лучыніну, адаб'е вугаль, каб яна ня дыміла. Тады возьме верацяно ў складзеныя далонямі рукі, як складаюць іх каталікі, молячыся, і раптам цірне іх адну аб адну... Верацяно, павіснуўшы на нітцы, доўга-доўга круціцца, аж пакуль матка не падхопіць яго. А падхапіўшы, яна шыбка-шыбка наматвае нітку сьпярша з вялікага на руку, а тады зараз, ужо як мае быць,—на верацёнца. І скубе і скубе яна левую рукою мычку, часам дужа

скоранька насьліньваючыся аб язык самы працавіты палец. Ї хлопчык мімаволі варушыць сваім такім-жа пальцам. А яна цягне і цягне рукою ад сябе, круцячы верацяно—убок, убок—і далёка наадмах, аж пакуль хапае тэй рукі. Ад яе працы (любая мамачка!)—вее ў сэрца з асьцюдзянелае хаты цёплым сумам. Гэтак цягнецца і вее сумам нашае жыцьцё... Ад яе верацяна зьвініць нудны і слабы, як камарыны гук, даўгі, бязупынны і жаласьлівы, як гэтая даўгая, цёмная, сумная зімовая ноч, з познымі вечарамі і раньнімі досьвіткамі: трынь-трынь-трынь!.. Ї ўсё ціха, і ціха сапуць, сплючы, дзеці, і рэдка-рэдка, ціхенька сакатне пад печчу курачка, паварушыцца там і змоўкне. А на вуліцы шугае вецер, а тут лучына гарыць сваім вагам, і хочацца ляжаць доўга-доўга. Але трэба ўставаць, варушыцца брацца за работу, за розныя бягучыя справы. Вось шугнуў за сьцяною зьлюшчы вецер, сыпнуў у замёрзлае акно сьнегам—і сьціх. Э, толькі трэба раптам, доўга ня думаўшы, падхапіцца, і ня будзе шкода вылязаць з цёпленькага на халоднае. Але-ж так ня хочацца...—«Будзі-тка ты яго!—кажа бацька матцы:—хай устаець, у дровы паедзем. Ну-ка, Хомка! уставай!»—крычыць ён сам.

*

— Уставай!—запраўды кажа бацька над ім, торкаючы за плячо, але не ў сваёй хаце, а ў чужой, у нялюбым заезным двары. Цела ные, ломіць косьці, ляжаў-бы, ляжаў, але трэба ўставаць...

Некаторыя возьнікі сядзяць ужо апрануўшыся і кураць. А той возьнік, што вязець крамніка і што спаў з хлопчыкам на печы, падлажыўшы хамут пад галаву, стаіць цяпер сярод хаты, зусім гатовы ехаць, падперазаўшыся, у рукавіцах, пуга ў руцэ, і голасна бурчыць:

— Што такое? Дзе-ж ён мог дзецца: быў прывязаны да гужа, а цяпер няма...

Справа ішла, як зразумеў герой наш, аб церазсядзельніку (іначай кажуць—падпінак).

З чыстай каморы выходзіць і сам крамнік, таксама гатовы ехаць, высокі і шырокі, з чорнаю барадою. Ён злуецца, што ня ўсё гатова ехаць, каб зараз ехаць і насьмешліва кідае падазрэньне:

— Раменны... Можа хто захацеў пазычыць?..

І хлопчык і бацька напранаюцца. Хлопчык баіцца, каб не падумалі на яго, што ён украў: бо ён-жа спаў на печы, ён-жа мог адчапіць сабе раменны падпінак.

— Што такое? Нікога на печы ня было, апрача гэтага хлапца ды мяне з хамутом,—бубніць і возьнік на крамнікаў здагад.

На гоман узьбіваецца з прыспанымі, нездаволенымі вачыма гаспадыня, узьнімаюць калматыя галовы і тыя возьнікі, што яшчэ спалі.

— Гм, падпінак укралі! Каб на заезным двары ды красьці, ніразу гэтага ня было,—устаўляе сваю ўвагу адзін з іх, што без барады, але аброс мохам і худыхудушчы дзядзька.

Хлопчык бялее, сэрца яго б'ецца рэдка-рэдка, але страшэнна дужа, і ў нагах—прыкрая мляўкасьць: «Як яны могуць думаць на мяне?» Але і бацька глядзіць на яго, быццам спытуючы: мог зрабіць гэтак яго сынок ці не?

— Эх, хлопчык, ты часам як-небудзь ня ўзяў на печы церасьсядзельніка раменнага?—з насьмешліваю пэўнасьцю, што ня хто—хлопчык украў, пытаецца ў яго крамнік.

— Божа мой!—бядуе апрытомніўшы гаспадыня!—век у нас гэтага ня было, каб зладзейства... Не такі-ж у нас заезд.

— Не, я ня браў,—няслухмяным языком кажа хлопчык.

— А ну, распранайся, пашукаем!—сьмяецца нягодным, прыкрым сьмехам крамнік.

— Не, ён ня возьме! Што вы гэта, добрыя людзі?—уступаецца-ткі за яго бацька.

Возьнік тымчасам яшчэ раз узьлез на печ, адсунуў пустую скрынку з-пад яец, мяшок з нейкім зялезьзем, бляшаную трубу, кійкі, усё, што там ляжала, абмацаў усе куткі,—няма! Абгледзіў сябе самога з усіх бакоў, перавярнуўся колькі раз і пашчупаў сябе перад усімі,—няма!

— Што-ж, трэба трэсьці,—кажа тады худушчы безбароды дзяьдзка.

І крамнік сьмела падышоў абшчупваць Хомку... Шчупнуў пад пахамі, за пазухай, ля лапцей... Бацька глядзеў, як каменны, гаспадыня глядзела з жалем,

дзед той, добранькі возьнік, глядзеў з крыўдаю, і ўсе возьнікі глядзелі з паганаю цікавасьцю на беднага малога хлопчыка. Як баяўся ён, каб ногды нейкім дзівам не знашлася прапажа якраз у яго. Ён ужо сам ня быў у сабе пэўны: браў ці ня браў?— Можа, узяў як скрозьсоньня... А крамнік быў незадаволены, зьдзіўлены, што нічога не знайшоў, і падазрона кінуў вокам на самога бацьку...

І тады ў хлопчыка высахла ў роце, як у самы гарачы жніўны дзень, ня чуў ён ні ног, ні рук: барані бог, знойдуць у бацькі... мог бацька ўкрасьці сабе на сотку.

— Трэба ўсіх трэсьці,—кажа крамнік; чаму аднаго хлопчыка? Аднаму—крыўда, усім ня крыўда.

— Усіх, дык усіх,—нездаволена, але шчыра згаджаюцца возьнікі;—усіх, дык усіх...

— Трэсьці, справа гэта прыкрая, але зладзейства—справа таксама дрэнь,—кажа худушчы дзядзька і ўжо расшпіляецца.

— Чаму гэта ўсіх?—разважае гаспадыня.—Пасьля гэтага, што прыехаў апасьля ўсіх, ніхто на печ ня лазіў. Чаго табе было лезьці? Пра што ты гаманіў там з сваім хлопчыкам?—пытаецца яна ў Хомчынага бацькі.

— Браточкі! Чым-чым, а злодзеем ня быў яшчэ,—шукае спачуцьця бацька.—Але трасіце сабе... трасіце...—расхінае ён свае лахманы.

Крамнік і яго возьнік бяруцца за бацьку, і хлопчык сагнуўшыся глядзіць, як яны лезуць у бацькаву

кішэнь, шчупаюць ля пояса, пасьля кажуць: «А дайка торбу»,—і глядзяць у беднай торбе.

— Можа ты на санёх забыўся?—пытаецца гаспадыня ў таго возьніка.

— Ды не-ж, кажу табе: прывязаўшы быў пры гужу,—сварліва адказвае той, але ідзе на двор, каб паглядзець яшчэ раз.

І болей нікога ня сталі трэсьці. «На нас толькі думалі», цяміць хлопчык, і цяпер ён ведае, што бацька будзе злосны будзе сёньня ўвесь дзень біць коняй і крычэць на яго. А за што?..

Падводчык зараз, але марудна ідзе ў хату.

— Ё,—вінатава і панура кажа ён адно слова, маючы падпінак у руцэ.

— Дзе ён быў—пытаецца крамнік.—У чыіх санёх?

— Неяк утаптаўся ў сьнег ля возу пад павецьцю.

— Дурны-ж ты, дурны!—лае яго, павесялеўшы, гаспадыня.

— Яшчэ злодзем ня быў,—важна аглядае ўсіх і бацька.—Ну што, сынок? Людзі думалі, што зладзеі, ажно і не!—жартуе ён з сынам так, што Хомка баіцца яшчэ болей.

— Дарма пакрыўдзілі чалавека,—уступаецца тады і добранькі возьнік-дзед. Хлопчык, аднак, ужо меней любіць яго цяпер, бо раней і дзед, як і ўсе, маўчаў, не заступаўся.

— А ў цябе хто пытаецца?—гыркае на яго, мужыка, крамнік;—усе вы добрыя!

— Яно і спаміж вашага брата—бываюць гэрцыкі!—не баіцца яго дзед.

— Што? Што ты мяне тут лезеш?—падступае з вялікім запалам шырокі той, чорнабароды крамнік...

— Спалохаўся цябе, як кабыла зайца!—зьняважліва жартуе дзед і дадае:—Перш самога-б цябе патрасьці, каб цябе лысыя трэсьлі...

Крамнік плюецца і выходзіць. Возьнікі рагочуць.

— А дай-ка, Пэся, яшчэ сотку, на дарогу пагрэцца,—просіць бацька і ўкрадня пазлядае на хлопчыка. Хлопчык утупіў вочы.

— Што табе тут... манаполька?—гневаецца гаспадыня.

— Ну, ну, дай...

— Матруна! Прынясі ўжо яму сотку, хай ужо ён спакойна едзе ад нас,—згаджаецца гаспадыня.

Матруна бурчыць, сапіць, скобліцца, кляне і прыносіць сотку. Яны выходзяць.

Пад павецьцю бацька выпівае, чамусьці адвярнуўшыся да сьценкі і трошку недапітага падносіць сыну.

— Пагрэйся, сынок, на дарогу.

— Не хачу я...

— Ну! Ня дурэй!

Хлопчык з агідаю дапівае. Ён цяпер ведае, што ўвечары бацька нап'ецца на станцыі, дамоў нічога не прывязуць, бо нічога не заробяць пасьля тэй выпіўкі. Бацька будзе злосны, будзе крычаць, біць коні...

Хлопчык здрыгаецца ад гарэлачнага паху, а бацька голасна разважае:

— Чым-чым, а злодзеем яшчэ ня быў...

І ў яго словах ужо чуецца вялікая злосьць.

Ды вось санкі заскрыпелі, і пачынаецца ізноў дарога...

МЛЯВЫЯ СЬНЕНЬНІ

1

ЖНІВО. Раньне.

Сьпелае жыта схіліла каласы. Блішчыць раса і буйнымі круглымі сьлязьмі капае і з коласу і з тонкага залатога сьцябельля. Тхне сьвежасьцю зямелька...

Там а там сінеюць чароўна-прынадныя галоўкі-красачкі ціхіх васількоў. Трыпутнікам, гугалем і мышыным гарошкам парасла высокая мяжа.

Падзьме цёплы, і густы, і лёгкі ветрык—і ад жытняе сьцяны іньлецца і плывець пах упрэлай палявой зямлі і ціхамірнай няпрыкметнай румянкі, сыплюцца ў сем колераў вясёлкі розныя пэрлы, дыхаючы ўгору духам цяплыні.

Шырокая а далёкая жоўтая ніва! Там, пры далёкім лесе, у дымнай імгліцы, мусіць, канчаецца яна.

Шарпае пад лёгкімі лапцікамі колкае і яшчэ поўнае соку іржышча. Грубыя, туга зьвязаныя снапы разьляглiся, як купцы, бавячы погляд. Ня хочацца думаць, што там, на ўзгорачку, на пясочку ёсьць і

рэдзенькае, жыдзенькае, дробненькае жытца з малюсенькімі каласінкамі. Сумна там... Затое-ж тут, дзе яно буйнае, дзе яно густае,—надта хораша! Дзятліна зелянее патройнымі лісьцінкамі. Клякоча скакунец-каваль. Гудам гудзіць сіня-пазалачваная муха. Трапыхаецца і снуе туды-сюды над жытам жоўценькая мятлушка.

А нечыя жнеі прышлі ўжо на пастаць— пад самы лес. Лётаюць па-над жытнім морам каласяныя жмені і хаваюцца ў ім. Уздоймецца галава ў белай намётцы, блісьне на плячы гібінка сярпа, тонкія рукі круцяць вязьмо. І зрок задумана стаіць на дальнім ускраі паласы-шнурочка... «Відзіць маё вочка, што край не далёчка! Відзіць-жа і другое, што яшчэ ганей двое!..» Схавалася белая намётка,—узьмятнулася чырвоная хустачка дзяўчыны... І дзьве жмені, гнуткія, шумацяць, мятаюцца і мятаюцца.

Вуха з радасьцю ловіць аднастайную музыку-іграньне сярпоў: хруп! хруп! хруп! І шамае жыта...

Подаўна час маленькаму канюшку прахапіцца ад смачнага сону і бегчы дахаты, несьці адтуль сьнеданьне касцом на сенажаць. Подаўна час яму прачнуцца і вылезьці з-пад куста: гняды конь узьбіўся на чужую пожню і выскуб тымчасам ужо добры лапік.

Нейкая няўцямная сонная трывога сьціскае сэрца, і няма сілы ачуняць. Сьненьні, поўныя бясконцага змаганьня, надзей і перашкод, паглынулі ўсю ўвагу, скавалі розум...

*

Сьніцца яму...

Калядныя сьвяткі. Вечар. На вокнах—маты, а за імі, за сьцяною, на вуліцы і на падворку—сьнег, лютая сьцюжа, дробная мяцеліца і цёмна, цёмна. Бось-то самая ваўчыная пара ў пахаваных сьнегавою дзяругаю, мутных і нямых, страшэнна-пустых палёх.

Прытульненька, хаця і скупавата, слабенька дае на сьвяточную хату сьвятло падвешаная на шосьціку лямпачка. На палу паселі бабы і гамоняць аб драбніцах жыцьця свайго.

Там і Хомкіна маці. Хомачка цярэбіць у руках шабадраную, з аблезлымі штучнымі баранькамі, шапку; пераступаючы растаптанікамі, горнецца да матчынай спадніцы і пільнуе хвартука. Ён узіраецца на Лявоньку, што сядзіць за сталом і чытае кніжку, прыхінуўшы яе стаяком да вялікай булкі хлеба пад абрусом. Чытаньнік нездаволена ўзьнімае галаву на асяродак хаты, а дзе з кійкамі і косткамі (ад сьвяточнага абеду) гуляюць дзеці. Дзеці тлумяць галаву, але не падходзяць блізка да чытаньніка,—хай сабе ён чытае свае кніжкі і ня злуецца на іх. Хомачцы страшэнна карціць падыйсьці да столу і ўзяць кніжку ў самыя рукі. Але нешта прыкавала яго: чуецца ад-заду нейкае патаёмнае хрупаньне... (А гэта авечка, узятая акаціўшыся з сьцюдзёнае пуні ў цёплую хату, хрупае сянцо пад палом). Дзеці поўзаюць рачыкам, равуць: «Ай, воўк! Ай, воўк! Зьем! Зьем!» Потым

едуць конна—той на тым... І ўрэшце спраўляюць такі вархал і гармідар, што трэба супакайваць іх спачатку крыкам, а потым матузом ад хвартука. Ціхае сумаваньне ахапіла хлопчыка: чаму няможна падыйсьці і ўзяць у самыя рукі кніжку? У іх у хаце няма ніводнай кніжкі, а шматок газэціны, што прывязьлі з сольлю з Лугвенева, бацька разгладзіў, добранька зладжыў і схаваў сабе курыць. Нельга паглядзець кніжкі: Лявонька злуецца—і не дазволіць. І гэты патаёмны хрупат адзаду страшыць... У задуме глядзіць Хомка на галузваньне і дуронства малых, і, калі іх пачынаюць біць за тое, што адураюць галаву, ён палахліва прыліпае ў куточку і жаласна самотнічае ў ім. Дзівуецца адтуль, што навакол ад сьвятла лямпы—зялёны персьцень, і ўва ўсе бакі—залатыя касулькі. Прыплюшчыць адно вока—касьнічкі растуць, бягуць далей, як жывыя. Чаму яно так? Ну чаму? Няма адгадкі, чаму... І яшчэ гэты патаёмны хрупат адзаду... І вось яшчэ: чорныя сьцені скачуць па сьценах і кутох—як-бы і людзі, толькі нямыя, хоць і рухавыя,—яму страшна, ён палохаецца, але ніхто не спагадае яму. А сьцені, быццам спуджаныя нейкім зданьнём, усё бегаюць і ківаюцца... І раптам скончылася патаёмнае хрустаньне, страшная чорная морда з агнявымі, кацінымі вочкамі зірнула з-пад полу... (А гэта авечцы дакучыла там і захацелася выйсьці з-пад полу на волю). Жах абуяў хлопчыка, і ён валіцца наскрозьдоньня, глыбей, глыбей... Высака, хто ведае дзе, крычаць бабы: «Хомка! Хомка!..»

*

Крычаць бабы наяве:

— Хомка! Хомка! Шпак дурны! Коні ў панскі лог ускочаць,—забрытаюць лясьнікі! Дзе ты праваліўся, Хомка? Ага-ту! Ага-ту! Сьпіш пад кустом, абуза, і ня бачыш!—крычаць на полі жнеі.

— Прачніся, а прачніся!—шапочуць яму кусточкі лазовыя.—Табе сьніцца твая дзіцячая пара, але не тады—цяпер крычаць бабы, каб ішоў ты зганяць коні. Прачніся! Агу, будзе бяда!

Сон скаваў хлопчыка, замардаванага надмернаю працаю летняе пары. І няма ніякае магі парваць хваравіты ланцуг сьненьняў—і трывожных, і тамуючых, і супакойных...

*

...Вясна. Парыцца зямелька. Буры лес пукацца пачаў, і ўжо раскідаецца, і ўжо ўкрываецца руньню ліпкіх лісточкаў. І поўныя вадою аборачкі разьліліся. Па вадзе шалёпаюць басанож малыя дуронікі, закасаўшы нагавіцы, задраўшы кашулі.

Цягаюць бабы па вадзе шэра-белыя суровыя палотны, па першых стужачках сёлетняй травы; гулка хлэпаюць пранікамі, галошачы воддаль вясёлым гоманам. Настаўнік, ужо трэці ў Асмолаве на Хомчыным веку, сын Лугвенеўскага царкоўнага старасты, узглабаўся на высокую дульку, поверх новай жоўта-саламя-

най школьнай стрэшкі, абразаць пілкай-аднаручкай глухое гальлё. Настаўнік гэты, кажуць, добры, але Хомка ўжо ня ўчыўся болей, як яго сюды прыслалі. Настаўнік добры і добра адукаваны: скончыў настаўніцкую школу. Аднак у яго загана: страшэнны п'яніца. Ён носіць акуляры, і акуляры яго зваліліся з дулькі, і ён, няўзоркі, смокча сваю цікавую куплёную трубачку з чырвоным цыбучком і пазірае адтуль, з высакосьці, на бедную пакуль што, ды ўжо вясёлую, харошую вясноўскую відаль палёў, лагоў і лесу. Снудзяць сохі і бароны людзі па ўсіх дварох. І прыкра Хомцы, што бацька яго, гаспадар няспраўны, у такую пільную часіну, калі трэба выхадзіць на працу ў поле, сабраўся-ткі лён церці, ляпае адзін у лазьні мяліцаю. А нічога!—ня ўсё дрэнна робіць бацька: к вясьне кабылу во купіў, ато каторы год без свайго каня жылі. Ганарыстая купілася кабыла: ня хоча хадзіць на папасе, ліха нясе яе на жыта,—у самахоці адкуль ёй і тая шпаркасьць у бягні бярэцца? Як запрагуць, дык хоць кіем лупцуй яе—шыбка не бяжыць, а тут во ляціць і ляціць на жыта. Разоў колькі бегаў бацька з лазьні зганяць яе са шкоды. «Вось, мусіць, злуецца», разважае Хомка: «Пасобіўбы яму пасьвіць кабылу, ды гаспадарская работа не дазваляе батраку». Ішоў нехта міма, па шляху ля жыта, закрычэў: «Юркава кабыла ізноў у жыце! Абы забагацеў на каня, дык і пачаў чужы хлеб травіць». Лягчэй Юрцы скрозь цэлы дзень разу хлеба ня ўкусіць, як пачуць такое ад каго. Кінуў

вобзем раскірэку-мяліцу, рынууся кабылу лавіць. А яна, дурніца, ня ловіцца і ўбрыкнуць яго ягліцца. Але-ткі забрытаў, сьціснуў ёй храпы нахрапнікам і прывязаў за повад да разложыстай вярбы. Выкрышыў у плоце падгнілы зьнізу, але здаравенны кол, сьцяў аберуч і ну бастоліць дурнаватую жывёліну. Заб'е! Авохці! Дадушы, заб'е! Дрыжыць усё ў Хомцы, як струна. Штосьці во-во парвецца... І вурзнулася аб зямлю падбітая кабыла. Выцягнула, як дылда, свае нязграбныя ногі. Бяжыць туды, выючы, матка, бягуць на гвалт людзі. Трахнуў Юрка кулаком і жонку па галаве. Куламеса і выцьцё! Усе пачуцьці зьліліся адным комам і расьпінаюць кволую Хомачкіну душу: сум і жальба, злосьць і боль, і нейкая глухая пакора паняволенага перад няўхільнасьцю...—«Ён думае, калі яму ні ў чым ня ручыць, дык можна кабылу да сьмерці забіваць, можна маму біць,—з надарванасьцю кажа некаму Хомка; ня жаліцца, не, так проста сабе кажа:—на кірмашы ўмаўляла мама, каб ня купляў гэтае кабылы, ня верыў цыгану, няладная кабыла... не паслухаў! Калі-ж ён з цыганом больш уважаецца, як з намі.—І горкае гора, як тая вада праз грэблю, прарвалася і залівае ўсё чыста буйнымі, гаручымі сьлязьмі. І рыгае, і сударжна хліпае: «Забіў кабылу... гы... гу...»

Ці ня дзіўна вам, што герой наш плача ўва сьне па скалечанай кабыле, а не па маці, жорстка зьняважанай бацькавым біцьцём? А ці ведаеце вы, што

мецъ сваю кабылу—было найсаладзейшаю думачкаю ўсяе сям'і цераз доўгі час? На тое, каб ужыцьцёвіць гэтую салодкасьць, пайшлі недаспаныя раніцы дзяцей, што бегалі ў грыбы, зьбіраючы іх на продаж і рызыкуючы трапіць пад бізун панскага аб'ежчыка. На тое пашла яешанка самага вялікага сьвята, бо дзеля грошы на кабылу яйкі ехалі на Зэлікавым возе ў Воршу ці ў Смаленск. Тэй-жа думкаю палягчалася ґарката дзіцячых сьлёз і выцьцё і кляцьба маткі калі Юрка ўпіваўся: слова «кабыла» спыняла лішнюю чарку ў паветры край самага роту і ставіла яе назад на стол. Дык ці-ж можна раўнаваць з кабыліным калецтвам матчыны сьлёзы і матчына выцьцё пад бацькавымі кулакамі—такія звычайныя зьявы ў штодзенным асмолаўскім жыцьці? Ці-ж ня сын свайго бацькі, ці-ж ня сын свае маці герой наш, калі найгарчэй плача ён ува сьне па сваёй скалечанай кабыле?

*

Шумацяць над яго ўпоенай сонам дробненькай постацьцю лозы і веюць трывогу. «Прачніся!» Прачніся,—шапочуць яму лісточкі:—сонейка высака-высака, гаспадыня кляне цябе на чым сьвет стаіць, а гаспадар, ня бачачы і ня чуючы батрачка са сьнеданьнем, варочаецца з сенажаці з касою і граблямі на плячы і клянецца выбіць з цябе тваё батрацкае гультайства і нядбальства».

— Прачніся, прачніся, Хомачка: гаспадар блізка,—шапоча яму і ляшчына, цікуючы, што з гэтага ўсяго будзе.—Я хацеў-бы прахапіцца, я хацеў-бы стурыць гнядога з патравы і бегчы дамоў, але цела маё ня слухае мяне; яно разморана, яно прыкута нечым да зямлі...

*

Сьніцца яму цёплая раніца ўлетку, але ня будні, а сьвята... Такая-ж цёплая, чыстая раніца! На падворку, дзе сонейка цалуецца з залатою саломкаю, порскаюць парасяткі рабенькія і чарнюсенькія, бы жучкі, і пярэсьценькія ды аржава-рудзенькія—усе з гладзенькай шэрстачкаю, з маленькімі, дзяцінымі чысьценькімі лычыкамі. Жартуюць, клычуць саломку. Піскнуць, брыкнуць, схопяць жменьку ў зубы іківільківіль! ува ўсе бакі, круць-круць! дробненькімі закруцістымі хвосьцікамі. Рохкае матка іхная ў сьвінарцы, каб ішлі туды, дзе яна, а ім хочацца гуляць на сонейку.—«Вуль-вуль-вуль...»—чуецца пад страхою прыемна-нечае галубінае вульканьне. Дзяцей сваіх песьцяць галубы, на волю іх гукаюць, лятаць іх навучаюць. То ў пуню, то з пуні ды на хату, на страху шпурхаюць галубы ды ўсё вулькаюць-брукуюць: і ў катухох, і на страсе пад сонейкам. Вулькаюць і мыюцца, насок аб насок точаць-смычаць, цалуюцца-мілуюцца, пёркі слабенькія выкідаюць. Голуб за галубкаю з ласкаю тураецца, разьдзьмухваецца-дзьмецца і грозіцца;

вурр-вурр-вурр... Павурчыць ды ізноў салодка завулькае, нега і тамуча—сам шызенькі, галоўка пазалачваная. Гострым лётам рэжуць чыстае, лёгкае, сіняе бяздоньне ластаўкі, вырабляючы неспадзяваныя петлі і павароткі. Раптам нураюць яны ўніз, а тады стрэлкаю кідаюцца ўбок аж і ізноў угору. Перабіраюць гострым шылястым крылейкам ці распусьцяць яго і шыбка плывуць, як-бы і ня ведаючы, куды яшчэ кінуцца. Зморацца, пасядуць на вільчыку на страсе, на дзядзькавай сяніцы—і шчабечуць белагрудыя шчабятухі, круткія, шыбкія пяюшкі-ластаўкі: «На моры, была, за морам была, ня бачыла такога хлапца Хамца: сьпіць-сьпіць дый падсьві-і-істывае...» Ах, ужо высока сонца! Высока сонца—добры сьцень даюць яблыкі ў гаспадаровым садзе на грады, дзе сагнулася гаспадыня ў баразьне, бацьвіньне на абед ламаць. Буйнае, густое парасло ў іх сёлета бацьвіньне. Яшчэ не абсохла тут раса, яшчэ макравы мак,—не расправіў падзённаму свае ляпёстачкі, аксамітавыя, чырвоныя ў добрага маку і бледа-блакітныя, з цямнейшымі плямкамі пры ложакветніку ў мака-самасейкі. Яшчэ на тых ляпёстачках павісла брылянцістымі капачкамі сьлязлівая роска. Ды ўжо прабіўся скрозь лісьці на сьліўцы сонцаў ход—і зайграў вясёла ў тых капачках... І харашэе мак, узносячы тут і тут, густа на густым шызым і квола-крохкім сьвежым сьцябелейку буйныя і дробныя мачынкі і груд цьвету; панік сланэшнік кружэлкай жоўтацьветнаю, загадзя пакутна асьмягаючы, Асьцярожна з-пад шурпатага лісту вы-

кацiў свой бачок на ранiшняе халадкавае сонца малады гарбуз. А гарбузеньне, пазаняўшы завугольле i кожны закутачак, абходзячы, ды ўсё-ж глушачы тую моркву, рэпу i цыбулю, пнецца кручанымi вусiнамi на плот i жаўцее сабе блiжэй да сонейка. Бачыць ярая пчолка яго жоўты цьвет—i зьвiнiць i паўзе на яго, набiрае жоўтага пылу на свае бахматыя ножкi. Яшчэ не адцьвiў на сонцы зялёны боб з чорна-белым цьветам. Вiецца фасоля з павiслымi стручкамi-лапаткамi. Пасьля ранiшняй расы вайстрэй пахнуць галаваценькiя канапелькi. I бульбовая нацiна не зважае на бясконцу пасьпешную ў разрастаньнi макрыцу i на прычэплiвую, заблытаную бярозку, а бялее i жаўцее, колькi можа, сваiм нядужым, простым цьветам бульбовым. Лёгкай, сьветлай хмаркай вылятае дым з комiна, там i там над хатамi... А ў тых хатах сьвяточных—дзе блiны, дзе скварачкi, а дзе i яешня на сьнеданьне, бо ня ўсе-ж i асмолаўцы такiя незаможнiкi, каб хоць у сьвята ня зьесьцi скваркi. Гуляе срэбранымi касякамi i блiскучымi зайчыкамi сонца па лавах, па застольлю i на абрусе. Яшчэ ня справiлася зусiм ля печы гаспадыня, i стаяць некаторыя гаршкi i мiскi на лаве i на суднiку. Бралася ўжо месьцi хату, а за нечым там пабегла—уздумала яшчэ—i пакiнуты галень супакойна чакае на яе пасярод падлогi. Мухi бяз клопату лётаюць над крошкамi па ўсёй хаце, а найболей за сталом i ля суднiку, туды i назад. Часам другая зычна зазьвiнiць з радасьцi, як той авадзень. Хомачка вярнуўся

з начлегу і сьпіць, бо сьвята, не хапацца на работу. Тармасілі яго разы два, што блін гарачы ёсьць, з ячнае мукі (блін ячны—смачны), ды адбіўся, пацмокаў трошку і ўзноў заснуў. І кацянё сьцёплілася ў яго пад бокам. Вось як слаўна! Праўда, зьбіў ён дзяругу з гарохвіны; часам моршчыцца ад сонца, сонны, адхінаецца; раскінуў рукі каросьлівыя, ніколі ўважна не памытыя; нагамі, пстрыкатымі ад цыпак, брыкае скрозьсоньня, бо мухі—ай, што за дакучлівыя мухі!—ліпнуць, аж ў рот і ў нос лезуць... Ах, што за дакучлівыя мухі! Не даюць хлопчыку спаць...

Але-ж ёсьць і ў Хомчыным маленстве залаценькія дзянькі; і яму-ж порскалі парасяткі на сонейку на саломцы; і яму-ж галубчыкі вулькалі, а ластаўкі ў сінім, чыстым, цёплым бяздоньні купаліся; цьвілі-ж і яму тыя добрыя і простыя макі... Ды еў-жа і ён салодкія яблычкі!

*

Восень. Ураньні дзеткам ня так смачна і доўга сьпіцца, як ў вясну і ўлетку. Цяпер, як толькі блісгуць па хаце, скрозь акно, яшчэ нясьмелыя ранішнія сонечныя зайчыкі, дзеці ўсхопліваюцца і бягуць насустрэчу новаму дню. Босенькія выбягаюць яны з хаты на ганак і, чуючы холад у ногі, дзівяцца, зірнуўшы на стрэшку: уся яна белая—белая ад маразянага налёту. Мароз асеў на страсе. Там, дзе сонейка ўжо дастала,—мароз растаў, і мокрая страха блішчыць роснымі капачкамі, а над ёю ўзьнімаецца ў ядранае паветра

пара, як лёгкі дымок. На двары, на саломе—тая-ж маразяная бель, толькі слабейшая; вось пратапталі ўжо па ёй сьцежачку да клецi і ў пуню. І жывёлу выпушчаюць цяпер у поле позна: маўчаць у хлявох каровы і авечкі, і толькі сьвіньні рохкаюць і рвуцца на волю, каб бегчы на бульбоўнік на цэлы дзень.

У паветры нейкая ціхая восенская дума. Быццам віхаецца яно: ці даць сонцу распаўсюдзіцца, абагрэць зямлю, узьвесяліць дзетак і ўсё жывое й няжывое, ці-то ўжо прыцісьнуць як мае быць гэтым восенным марозам—шэраньню і пусьціць зіму, сьнег і сьцюжу, бо ўсё роўна аслабела сонца—сьвеціць, стараецца, а ня можа абагрэць, як грэла ўлетку.

З суседзкага гумна чуваць пуканьне цапоў: пук-пук-пук! та-та-та! Там ужо дамалачваюць запыленыя, закураныя малацьбіты. З ціхім здаволеньнем ад зробленае працы паглядаюць яны: ці ня ідуць ужо гукаць іх сьнедаць?

Выкаціў Хомчын бацька калёсы на сярод двара, выпусьціў аглоблі з рук, і яны брыкнуліся на зямлю. А маці сабрала большыя і меншыя кошыкі і цяжкія, з наліплаю зямлёю мяхі і ўскладае на калёсы, каб пасьля сьняданьня не марудзіць і зараз ехаць у поле капаць бульбу.

— Бяжы, Хомачка, па каня,—кажа ён сыну.

*

— Каня! каня! каня!—крычыць хтосьці дзесьці... Чуе Хомачка праз сон, а прачнуцца ня мае сілы.

Сьніцца яму, сьніцца яму...

Цішэй шапочуць лазовыя лісточкі: «Прачніся прачніся!..» Няма надзеі: сьпіць хлопчык, як забіты. А пара-б і выспацца!

Аднатонна зьвініць яму над вухам авадзень. Мятлушка з рабенькімі крылцамі снуе над ім свае небачныя ў паветры ўсновы.

*

І ўжо сьніцца яму, сьніцца, быццам хлопам валіць сьнег і стогне завіруха. Зіма. Грудам сыпляць па вуліцы хлопчыкі-вучні з торбачкамі на плячох. Гарадчанцы кідаюць сьнежкамі ў асмолаўцаў. Хомка ціха, але ўпорчыва ваюе за сваіх... Прыціснулі іх гарадчане, трапіў Хомка ў глыбокі сумёт, праваліўся— і тоне глыбей, глыбей... А нейкі гарадчанін шпурляе і шпурляе ў яго балючымі крамянымі сьнежкамі, няўпрыцям узлаваўшыся ў гульні.—«За што?— са сьлязамі і так ціха, што нячутна і сабе самому, пытаецца Хомка,—за што?!» І глыбокая, распачлівая крыўда кроіць яму сэрца...

*

Над ім стаіць гаспадар, і грабяльнішча са злою разьюшонасьцю стукнула па разамлелым, зьнямоžаным, прыспаным целе.

— За што?!—выстаўляе рукі спуджаны со-сну Хомка... Усхопліваецца, цяміць...

— Дзядзечка, ня буду! А родненькі, ня буду! Баліць!..—галосіць бедны Хомка.

— Яшчэ пытаешся, за што! Вось я табе спаганю сон! Ах ты, нягоднік! Гультай, батрацкая натура! Вось я табе, пакажу сон!

2

І дзень—як дзень... Сьнедалі, потым хадзілі разьбіваць сёнешняе і падварачваць учарашняе сена. Абедалі, потым награблі тры вазы сухога на балоце і пакачалі ў кучкі вык. Вярнуліся, потым Хомка занёс бабам на жніво гляк сьцюдзёнае вады, а гаспадар раскладаў пад асецьцю і падмятаў гумно. Баяліся, каб не нахмарыла, і, схапіўшы па кавалку хлеба і па кусту цыбулі, коні ў аглоблі—і затарарахалі, затарахцелі, закурылі пылам па шляху на поле па снапы.

І дзень—як дзень... Толькі болей пільнуецца Хомачка паказаць рупнасьць сваю ў рабоце, болей дагадзіць, каб забыўся гаспадар на яго сон і што спозьніўся з начлегу.

Яшчэ яны мімаездам напаілі коні ля калодзежа, і ня з жолабу, а з вядра, а што засталося ў вядры, тое вылілі каню, кожны свайму, пад бруха.

Яшчэ той галуза, што ўчапіўся бьгў за Хомчыны калёсы пад'яжджаць, сеўшы абенаж на жэрдзь [1]), ухапіўшыся за наклеску, каб не зваліцца, і перабіраючы

[1]) Ці, як кажуць у іншых мясцовасьцях нашае прасторнае бацькаўшчыны, рубель.

нагамі, быццам едучы, як яму хацелася, на «лі-сапэ-це»,—яшчэ ён, саскочыўшы ад Хомчынай пастрашкі пугаю, сонна пляцецца назад да свае хаты і лукава паглядае скрозь плот у чужы гарод і цераз леску ў чужы сад: ці ё хто ў будцы ці няма нікога?

Яшчэ доўга боўтаецца пасьля іх ля калодзежа вага, а дзяўчынка з чужога поля ловіць яе паднятаю вышэй за галаву худзенькаю і цьмянаю ад сонца праваю рукою, а леваю абцірае дзіцячы пот з лобу і вачэй, шыбка і хараша нахіляючы русявую галоўку наводмах, набок. Харошая дзяўчынка! Круглы носік і шэрыя вочкі. І чырвонаю гурынаю вышываны палічкі на кашульцы. Злавіла. Закруціўшы почапку, каб не ўвалілася вядро, глыбока топіць яго з канцом вагі—і цягне сьцюдзёнае-сьцюдзёнае вадзіцы... Прагавіта п'е з вядра сама, прыпаўшы да яго засьмяглымі вуснячкамі і абліваючы няўмысьля саматканую спадьнічку, а тады цэдзіць у дубовую круглую бітлажку. Цяжка ёй наліваць... Аблілася дужа! І сарамліва іншы раз азірнецца, ці ня пройдзе міма які хлапец з гэтай чужой вёскі,—быццам таму хлопцу дужа яна ў галаве, такая малеча. Бачыце, міравыя пасрэднікі і старасьвецкія каморнікі, наразаючы сялянам ад паноў зямлю, зрабілі так, каб дзяўчынка мусіла бегчы ўлетку па ваду з свайго жніўнага поля ў чужы калодзеж, бо да свайго дужа далёка.

Яшчэ ідуць з поля нечыя дзеці, хлопчык і дзяўчынка, і нясуць наповірку, на кіі, пустыя абедачнікі-спарышы ў махрастых раскарачох. І сварацца,

што заблыталіся недзе ў жыце, забавіліся ў красках на някошаным аборку, а ў іх-жа яшчэ і сьвіньням ня сечана, і цялушку, выходзячы з абедам, забыліся выпусьціць з пунькі на атаву і там на коліку прывязаць, каб ня лезла ў капусту, бо можа паламаць і вывернуць качаны. І пакутуе цялушка ў пуні.

Яшчэ яно быццам да вечару дужа далёка.

Ды неўзабаве кіне сонейка над лесам чырвоныя заходнія касулі, што з прыгожага, але трывожнага сьвятла. Сплывуцца сьветленькія болачкі ў бліскучахмарныя з краёў грудкі і вялікія сярэбраныя кучы. Асьвеціцца закат ціхім, супакойным, роўным полымем—і лягуць прахалодлівыя сьцені. Звалчэе троху на дарогах пыл... І пасядуць куры на шасты і дошкі пад цёмнаю і цёплаю страхою.

І вось ужо сабака бяжыць з поля, ад жней і ад касцоў; шчэміцца скрозь няшчыльна зачыненыя дзьверы ў хату—хоць-жа да сьвінога цэбра з мешанкаю і малою скарынкаю хлеба. Эх, не да канца ты поэт, сабака! Падаў цалюткі дзень на палёх, лясох і сенажацях, радуючыся хараству прыроды і сабачага жыцьця. А цяпер во забыўся ты на ўсё і, падцягнуўшы, як хорт, бруха, шукаеш скарынкі хлеба ў брудным сьвіным цэбры, глыбока макаючы і пэцкаючы разумную сваю морду...

КІРМАШОВЫЯ ПРЫЕМНАСЬЦІ

1

У ЦЯНЬКУ, пад павецьцю, ля дрывотні, яшчэ не растаў халадок ліпнёвага раньня. Але ўверсе, над пуняю, ля самага вільчыку, ужо ліецца-пераліваецца жывое срэбра з нагрэтага паветра, дакляруючы кірмашоўцам гарачы дзень на кірмашы ў Лугвеневе. Дрыжыць яно і мітусіцца і ўжо патроху зьнікае з воч, і ўжо няма... скрозь—сіняе, блакітнае, бы лёнаў цьвет, вялікае цёплае неба.

А ўнізе, пры сьценцы пад хатаю, на саменькім прыпёку і пад тым сьвяточным блінным пахам, што так прыемна тхне з напята-расчыненых дзьвярэй, ляжыць кудлатая Курта. І ўжо дужа прыпякае Курту, і ліпнуць ёй, як восвы, на зьедзенае ў больку вуха бязьлітасныя мухі з гною. Размарыла сонейка гультайку, і яна з прысілу, хаця-б мала-мала шавяльне сваім кудлатым, як каўтун, хвастом, і з крайняе патрэбы схавае раскрываўленае вуха ў лапу. З цярпліваю няўмешкаю ўва ўсякія, звычайныя, і часам нязвычайныя, людзкія справы, бокам плюшчыць Курта вочкі ад

бліскучых Петраковых ботаў, якія Хомка давёў да глянцу, што аж можна паглядзецца ў іх, як у люстэрка, і выставіў на ганку.

Не дарма стараецца так Хомка: ён сёньня пойдзе з гаспадаровым сынам на кірмаш. Пара, пара схадзіць і Хомцы! Сёлета ў касе ідзе ён з Петраком плячо ў плячо, як зусім вялікі хлопец. А Пятрок, праўда, што гаспадарскі сын, другі ўжо год шукае-выбірае сабе жонку, езьдзіць у сваты. Абы сьвята— ён на ігрышчах, на кірмашох. Пятрок езьдзіў у Смаленск, разы два пабыў у Магілеве, а Воршу, дык і лічыць яму няма чаго! Пятрок хваліўся, што ехаў у Смаленску на трамваі. На параходзе і то ўжо плыў ён, калі з хлапцамі і дзяўчатамі хадзіў у Бялынавіцкі манастыр. Хомка-ж, блізу роўны яму ў рабоце, нідзе далей Лугвенева і станцыі ня быў і сьвету бадай зусім ня бачыў.

А балазе—Пятрок! Ато-ж і сёньня павёў-бы Хомка пасьвіць коні. Ды вось, за колькі дзён да кірмаша Пятрок надумаўся, дакляраваў і пастукаў сабе кулаком у грудзі, што зводзіць на кірмаш хоць раз і Хомку. Ужо-ж вялікі, брат ты мой, хлапец! Дзеўкі лупаюць вачыма на яго пушок пад носам, хоць і пад кругленькім яшчэ, дзіцячым носам. Калі няма ім большых хлопцаў, дык лезуць да яго, чапаюцца, жартуюць... А ён—як і ня хлопец; бацька забірае сабе ўсё, што ён заробіць, і не пашыў яму яшчэ ніводных ботаў, ня справіў сыну аніякіх ніразу ўбораў... Пятрок сказаў, што дасьць Хомцы на кірмаш свае старыя боты, а

ў свайго бацькі папросіць яму чорныя штаны і саламяны брыль. Брыля гаспадар не шкадаваў, бо той брыль быў надта ўжо стары, запэцканы і ў дзірках: дастаўся ён гаспадару шмат год таму назад ад старэнькага дзяка-нябожчыка за нейкія паслугі. Але штаны нарабілі нямала клопату. Даў-бы Пятрок свае старыя, дык дужа вялікія на Хомку. А гаспадар упёрся, што ня дасьць сваіх новых штаноў. Зло брала старога, чаму Юрка ня справіць сыну чорных штаноў, бо сын-жа ходзіць па людзёх ня першы год і зарабляе... Чаму-ж ён яму ня справіць хаця з чортавае кожы? Нешта аднаго разу, пасьля спрэчак старога з Петраком, усё за гэтыя штаны, Хомка неяк украдня шуснуў за парог і пабег у пуню. Гаспадар вышаў за ім сьледам і неўспадзеўкі дапільнаваў там, што Хомка горка плача, схіліўшыся ў куточку на сьцяну. Бачыце, лагодная Хомчына натура, узгадаваная ў старых звычаях, забараняла яму выказаць свой жаль на бацьку пры чужых людзёх, і ён схаваўся краіць сэрца ў пуню. Стары ад такога ўчынку расчуліўся і сказаў Хомцы, што дасьць яму надзець штаны, каб толькі-ж уважаўся, каб не падраў, каб не запэцкаў дзёгцем ці ў зеляніну, лежачы на траве.—«Глядзі-ж, Хомачка, глядзі, шануй іх, бо яны-ж новыя!»—настаўляў яго стары, калі даваў штаны.

На кірмашох Хомка, блізу таго, ніколі і ня быў. Гаспадаровы дзеці пойдуць, а ён, служка, астаецца пасьвіць коні. І толькі цьмяна-цьмяна засталося ў памяці, як вазілі яго хворага ў Лугвенева, у больніцу, калі якраз

быў і кірмаш. Ён пралежыў тады цалюткі дзень на сваіх калёсах, сярод голага лесу ўзьнятых і падвязаных аглобляў, мноства коні і кароў, натаўпу людзей. Ён бачыў там чорных цыганоў, крыклівых, газардоўных. Яны таргавалі ў мужыкоў коні і ўсё плёскалі тым мужыком па далонях. Яму тады балела галава, яго дужа нудзіла, і не карціла яму, хвораму, браць у рукі паліванага коніка, у зялёныя і жоўтыя шнурочкі, што купіла яму матка. Так і ляжаў прыгожы конік бяз увагі. А гасьцінцы: вялікая цукерка ў залатой з прыгожымі махрамі паперачцы, вясла дробненькіх жоўценькіх бублікаў і кухан, ліпкі ад нечага салодкага і з паколенымі згары дзірачкамі,—усе гасьцінцы тады, неспадзявана, згубілі ўсякую прынаду. Да калёс прыходзіла худая і лупавокая Малка, Лэйзарава жонка, таго Лэйзара, што некалі меў у Гарадцы, а потым у Асмолаве кузьню. Цяпер яны пераехаўшы ў Лугвенева. Маці і Малка гаманілі, казалі адна аднэй, бабскім звычаем, пра ўсе свае злыдні і нястаткі, уздыхалі, жаліліся, адылі пакорна жартавалі і сьмяяліся самі з сябе. Калі хто бачыў, як сьмяюцца цяжка-хворыя або скачуць сухотнікі, дык гэты сьмех быў тое самае ці нешта надта падобнае. Малка гладзіла шурпатаю рукою Хомку па галоўцы; і хаця было няпрыемна, ён даравау ёй. А яна чамусьці, відаць, забыўшыся, звала яго ня Хомачкам, і Хвядоськам і пыталася, ці ён яшчэ не забыўся на Іцыка і Ханку, яе дзяцей: бывала, гуляў з імі ў Асмолаве і ня біўся, як другія дзеці, дужа дружыў з Ханачкаю, ды неяк адноўчы ўкінуўся

з ёю ў глыбокую ямку з вадою, і ўсе тады надта спалохаліся—думалі, што яны там зальлюцца. Хомка троху прыпамінаў, але нявыразьліва баўтануў галавою, бо ня меў ахвоты размаўляць і аж дзівіўся, адкуль гэта ў іх, у маці і ў Малкі, бярэцца столькі чаго зюкаць. Ну, пагаманілі-б троху—і даволі, дык яны гамоняць і гамоняць, і гамоняць... Малка-ж гладзіла яго негенька, як таго Іцыка, і казала вельмі жаласна, што бедненькі Іцык цяжка хварэў на шкарлятыну і памёр у яе на руках і на вачох у самога пана доктара Квяткоўскага. А весялей казала, што яе разумную, уф якую разумную, Ханачку заможная бабуля ўзяла да сябе ў Смаленска і адукуе там у такой школе, у якой вучацца толькі паненкі, дочкі заможных людзей.

Эх, калі тое што было! Цяпер Хомка—дарослы, і пойдзе на кірмаш як мае быць. Боты, брыль, чорныя штаны і белая вышываная кашуля! А коні папільнуе сёньня гаспадар: дзеля вялікага хлапца, як цяпер Хомка, здаўся стары на такую ласку.

— Барждждэй, Хамец!—гукае Пятрок.—Барждждэй, бліны ўжо на стале.

Ды Хомка і сам хапаецца, каб ногды не спазьніцца. Ня рана ўжо... Над страхою пчолы гудуць ужо падзённаму. Кулямі дзьвінкаюць яны цераз пуню з саду, а ў тое замор'е, што сінімі мядовымі краскамі зацьвіло. Вулькаюць галубы на вільчыку, пішчаць галубяняткі ў падвешаных пад стрэху катухох, ціўкаюць на плоце і на пуні верабейкі. Разгулялася пагода. Хыкае, выса-

лапоўшы язык, Курта і стамавана і пагультайску віляе на Хомку кудлатым сваім хвастом. Пахне блінным пахам... Добра будзе на кірмашы.

— Слухай, Хомка!—казаў дарогаю Пятрок.— Слухай, братка! Я там сёньня буду гуляць з гарадчанскаю Аўдуляю, а гарадчанскія хлопцы, ліха іх ведае, можа зачэпяцца біцца... Дык ты пільнуй! Як якое што, дык ты мне міргані, а сам зараз гукай асмолаўцаў.

— Добра, добра,—патураючы, адказваў Хомка, але нешта трывожлівае і няпрыемнае скаўзанула яму краем пад лыжачкаю. Нашто гэто біцца? Вось яму так добра... І ўсім павінна быць добра. Хаваючыся ад сябе самога, сарамліва аглядае сябе ён: боты блішчаць... праз саламяны брыль падзьмухае ветрык. І так ён здаволены, так радасна дыхае лёгкім паветрам у полі, з такою ўлюбёнасьцю аратая лашчыць вокам ніву,—што пра бойку яму і думаць ня хочацца. Да ўсіх казаць нейкія найласкавейшыя словы, усім рабіць нешта найпрыямнейшае жадаецца яму.

Хто пазнае ў ім парабка? Сына—заняпалага п'яніцы Юркі? Ён, кажуць, хлопец як хлопец: можа і ня дужа прыгожы, а ўсё-ж ткі троху прыгожы. А цяпеража так прыбраўся! У Лугвеневе зьбярэцца шмат харошых дзяўчат, вясёлых і хораша ўвабраных,—і Хомка будзе любавацца на іх, колькі яму захочацца. І яны будуць з ім, як з роўным. Ніхто не падумае пра яго што благое: гуляе хлопец на кірмашы—ну і гуляе!

— А ведаеш ты што, Пятрок,—кажа ён, калі ў дарозе параўняліся з гаем;—скіну-тка я тут боты... Нагам лягчэй, і боты на карэньні зьбівацца ня будуць...а?

Пятрок усьмяхаецца: надта ўжо клапоціцца батрак аб гаспадарскае дабро.

— А як сабе хочаш,—кажа ён.

Пакуль Хомка разуваўся, іх нагналі другія асмолаўскія хлопцы, і са сьмешкамі і жартамі пайшлі ўсе гаманлівым і вясёлым, сьмелым грудам.

2

Няўпрыцям прышлі ў Лугвенева, знайшлі знаёмых, і яшчэ знаходзілі з усіх бакоў, і разглядаліся па ўсіх бакох, а глядзелі так, быццам яны зваявалі гэтае мясьцечка або нейкую радасьць прынесьлі яму, што прышлі кірмашаваць...

Хомка тут яшчэ раз паслухаў Петраковыя наказы, як рабіць у магчымай вайне з задзірлівымі гарадчанямі, а тады неяк адбіўся і адзін удаўся ў натаўп. Ён ведаў, што Пятрок спачатку будзе шукаць Аўдулю,—а пакуль-то яшчэ знойдзе!—потым з ёю паходзіць, пагуляе і будзе, мусіць, частаваць яе півам, а вайна калі й пачнецца, дык-жа ня зараз. Хомка быў адзін спаміж мноства людзей, і няма ведама чаго—нейкі сум агарнуў яго.. І грошы ё ў кішэні, можна купіць, салодкае вады і прэжаных сланешнікаў, і можна пакатацца на драўляным кані ў крузе пад музыку.

Аднак ён меўся ў адзіноце, нясьмеласьці і яшчэ ў прыкрасьці ад ваганьня: патраціць на сябе гэтыя грошы, якія даў Пятрок, ці не патраціць? Другія хлопцы скакалі да зьнямогі, а Хомка некалькі разоў памыкаўся запрасіць на польку маладзенькую дзяўчынку з Гарадца, просьценька, але міленька ўвабраную, маўклівенькую, але харошую, ды аніяк ня мог насьмеліцца. Калі вялікі груд глядзеньнікаў раптам шухнуў у бок ад заядлых скакуноў, што быццам азялелі і ня бачылі нікога і нічога каля сябе наўкола, яна мімаволі схапілася за яго руку, каб не заваліцца, і ён, наш бедны, сарамлівы Хомка, асалавеў ад радасьці і, сам ня ведаў што, залапатаў ёй нешта, а сэрца ў яго буйна-буйна затыхала.

— Ганутка!—крыкнула ёй яе таварышка з кругу, думаючы, што яны ў пары:—чаму-ж ты з ім ня скачаш?—і засьмяялася.

— Пойдзем, калі хочаш!—коратка кінула яму Ганутка, і не пасьпеў ён абдумацца, як нязнаная сіла скранула яго рукі-ногі і пакруціла яго з ёю ў польцы.

Скакаць Хомка ня дужа ўмеў і скакаць было нязручна: пара налятала на пару, цяснота, а ногі зьбіваліся з тахту, бо кірмашовы гук і галас глушылі музыку... Вялікі пыл абняў тут усё-чыста. Хомка, апрача таго, сароміўся сваіх потных, ажно мокрыя былі, далоняў... І ніяк ня мог сябе прымусіць, каб не глядзелася няведама куды міма Ганукткі, а каб глядзелася троху пад ногі, а троху-ж і на Ганутку. Дык-жа не: кінуць вочкам ёй на плечка ён сяк-так яшчэ мог, а

вока ў вока—аніяк! І ня меў ён таго здаволеньня, аб якім так лятуцеў.

Па скоках ён сарамліва ёй падзякаваў, а яна шчыра ці няшчыра, але з дзявочай ласкаю прамовіла:

— Як ты добра скачаш... З табою дужа лёгка...

І трошку з ім прайшлася. Апынуліся ля будкі з салодкаю вадою. У будцы таргавала якраз Малка. Яна прыглядалася-прыглядалася, але ў такім вялікім і прыбраным хлопцу нізашто-б не пазнала Домнінага Хомачку. Калі-ж ён падаў руку і сказаў ёй, недамысьлівай: «Я—Домнін сын»,—Малка паставіла яму і яго дзяўчыне самую вялікую пляшку салодкае вады і два гліняныя кубачкі, хаця другім парам давала толькі па адным, насыпала дзьве шклянкі падсмажаных сланешнікаў, паклала два пернікі (якія тут завуцца папраднікамі) і пахваліла Ганутцы Хомку, нібы нейкага свайго радню. Хомка трошачку вагаўся: ці купляць тыя пернікі?—але Ганутка, адчуўшы гэтае ваганьне, так прыхільна сказала дзіцячым поглядам сініх вочак: «Ня трэба, до' і бяз іх»,—што яму раптам нязвычайна забажалася канешне ўбачыць пернік на яе чырвоненькіх, мякенькіх вусначках.

Калі-ж яны так сядзелі і частаваліся, падышоў сюды дзед з цэлым бярэмам дудак-пасьвісьцеляй. Дзед перакінуў бярэма на левую руку, узяў адну пару, прадзьмуў іх, абцёр і зайграў вясельную песьню, каб прывабіць на свой тавар купцоў. Усе—і Хомка, і Ганутка, і нават заклапочаная сваім убогім торгам Малка—з прыемнасьцю слухалі, як ён іграў. Груд

моладзі абступаў усё цясьней старога дудачніка, аж вось нейкі паніч, мусіць, паповіч ці малады настаўнік, захацеў выбраць у яго адну пару. Перабіраючы ўсё бярэма, якое стукала, як стукае ўсё пустое з тонкімі і звонкімі сьценкамі, ён сказаў аб аднэй пары:

— Эта пара нікуда негодна!

— Нягодна, малады чалавек?!—вясёла зьвярнуўся да паніча дудачнік, узяў гэтыя дудкі з бярэма і, не адвязваючы іх, а толькі троху да іх нахіліўшыся, зайграў... Ды так зайграў, што вялікі груд людзей адразу сьцішыўся, слухаючы...

— А што: нягодна, малады чалавек? Во і бярыце за тры капейкі ды грайце на здароўе, пацяшайце сябе і добрых людзей... Толькі вы на іх так не зайграеце.

Тады Хомка нясьмела пахваліўся сваёй дзяўчыне, што і ён умее іграць на пасьвісьцелі, толькі, пэўна-ж, так, як дзед, ён не зайграе... А дзяўчына прыхільна слухала.

Тымчасам недалёчка адгэтуль у Петрыка пачаўся з гарадчанямі вялікі неспакой. Гарадчане, наругаючыся, махалі грушавымі тросткамі, абступіўшы з усіх бакоў сваёю вяткаю яго і Аўдолю. І ўвесь разбойны натаўп марудна рушыўся да Малкінае будкі. Пятрок шныхаў вачыма, шукаючы Хомку і асмолаўскую грамаду. Малка, пачуўшы нядобрае, штосьці шапярнула Хомцы на вуха. Ён ускочыў і меўся кінуцца туды. дзе скачуць, бо там былі бязмаль усе асмолаўцы Аж у той-жа момант, на ваччу, як зьміргнуць вокам, бусайла-гарадчанін перацягнуў Петрыка па плячох

сукаватаю папірашкаю і распаласаваў яму крамны чорны пінджак. Ганутка ўхапілася з вялікага ўпуду за Хомку так, што яму няможна было вырвацца. Беглі на падмогу асмолаўцы, уцякла некуды Аўдоля, загаласіла Малка ў небясьпецы за свой тавар. Другі нейкі гарадчанін, п'яны-п'янюсенькі, убачыў пры будцы асмолаўскага батрака з сваёю гарадчанкаю— і ані з тога, ані з сёга дыргануў суножку пад малкіным ятком-услонам... Усе цукерачкі, сланешнікі і бедныя мудрагелістыя асушачкі пасыпаліся ў пыл, вокамгненьнем трапляючы ў кішэні ласых свавольнікаў-малечы, што тут як тут былі. Хомка на ўсю сілу, з абурэньня, штурхануў п'янага буйлу ў грудзі, але неяк зачапіўся ботам за калячок ад будкі, адарваў абцас і сам шлёпнуўся і расьцягнуўся ў пыле. На яго хтосьці заваліўся, хтосьці наступіў нагою, а белая вышываная кашуля жаласна запэкала і ўпэцкалася. Падбеглі асмолаўцы і зараз зваявалі гарадчаняў і аправілі Малкін гандаль, даўшы троху ў каршэнь гарэзьлівай малечы і шчодра заплаціўшы за салодкую ваду, якой цяпер, пасьля слаўнага бою, выпілі многа. Малка з большага зьмятала ніткаю Петрыкаў пінджак, а Пятрок, у ваднэй кашулі, стаяў героем сярод дружыны, рагатаў на ўсю глотку, сьмешна паказваючы, як была прыгода, і шкеліў з гарадчаняў, з таго, як яны ўцякалі пабітыя.

— А дзе-ж наш Хомачка?—пачалі пытацца хлопцы.

А Хомка, зьбіўшы з сябе крыху пыл, уцёк за будку шукаць Ганутку... Сэрца яго зашчымела: дзяўчына сядзела з адным сваім гарадчанскім хлопцам, якраз браценьнікам таго п'янога, што абярнуў услон. Хомка прыстоіў за рогам будкі, каб ня кінуцца ім у вочы, і ўбачыў, што Ганутка сьмяецца, а той ёй нешта кажа. Хомка прыліп, калі пачуў: «Батрак... хварсіць у чужых ботах і ў гнілым брылі». Хомчыны рукі адразу асьцюдзянелі. Яму нястрымана хацелася кінуцца на ворага, і кінуўся-б, каб толькі ня было тут гэтае Ганýткі. Добрая-ж і яна! Ды гостры гнеў хутка зацьміўся цяжкім прыгнётам, роспаччу і злосьцю да ўсяго на сьвеце—так, як бывала і ў яго дзеда і ў бацькі, алькаголікаў. Яму цяпер было так, быццам ён—гэта ня ён. Нехта другі, а ня ён цешыўся з харошага жыцьця яшчэ сёньня раніцою. Нехта другі, а ня ён, а калі ён, дык ня ўчора надвечар, а даўна-даўна, як у тумане, сядзеў на ральлі, скарадзіўшы жыта... Пралящела, як сон і з нейкім болем і цяжкасьцю вялікаю, што гэта-ж ён сам сядзеў учора на ральлі... адпачываў у чырвоным золаце сонца на захадзе... смакаваў сала з халодным блінам... радасна пазіраў на роўненькія сьлядкі ад кляцоў... на сваю добрую працу... І быў тады шчасьлівы, здаволены жыцьцём—жыцьцём аратая,—бо ў тым была праўда жыцьця... І думаў тады салодка аб Лугвенеўскім кірмашы, пагуляць на якім меў права за сваю працу... Хто-ж гэта пераменіў яго, зрабіў яго іншым, адабраў у яго радасьць і супакой і апаскудзіў яго?—Чаго цяпер жыць?

Адно... памерці! Але і думка пра сьмерць праходзіць бязуважна... Усё на сьвеце нічога ня варта... А бадайжа яно проклята было!

Хлопцы знайшлі Хомку, пацягнулі з сабою і ўпаілі нейкаю бурдою—мешанінаю гарэлкі з півам і салодкаю вадою. І ўсё рагаталі, рагаталі... А потым, пабраўшыся падпашкі, а іншыя, абшчапіўшыся з дзяўчатамі, пабрылі з песьнямі, і ўсё з рогатам, з дурным гоманам ў сваё Асмолава.

Хомку валок Пятрок—і ўсю дарожачку строіў жарты з яго першага вялікага кірмашу, з яго першых заляцаньняў да дзяўчыны і з таго адарванага абцаса. Ён выцягнуў абцас з Хомчынай кішэні, шпурляў яго далёка наперад па дарозе, станавіўся ракам, станавіў і Хомку так-жа сама ракам—і абодва паўзьлі па траве, курняўкаючы, як каты. Паўзьлі да таго месца, дзе шпякнуўся абцас, знаходзілі яго, і Пятрок ізноў кідаў, і ўзноў яны, п'яныя, вытвараліся катамі...

Хомцы было ўсё-'дна. Тупое і цяжкое адурэньне найшло на яго, прыціснула яго, згняло яго...

Ён пакараўся Петраку, ішоў, поўз, сьмяяўся, крычаў і пяяў, і хацеў плакаць... І з такім-жа тупым подзівам заўважаў патроху, што няма ўжо дзеннай духаты, што ўжо распаўсюдзілася прыемная вечаровая прахалода і налягае змрок з цёмнаю начою...

ПАРОГІ...

1

Вышлі роднай вёскі дзеці
Паміраць на белым сьвеце,
Расьсяваць па сьвеце косьці
Праз кагосьці, за кагосьці.
Засталіся нівы, сёлы
На той сум-жаль невясёлы,
Засталіся, ой, сіроты
З горкім горам, з адзінотай.

Янка Купала.

ВАЙНА ЗАСЬПЕЛА раптам: каго ў полі, каго на сенажаці,—і адгукнуліся на страшную навіну неяк лёгкадумна і вясёла. Запасьнікі папакідалі косы, цалюткі вечар пілі і елі, быццам вялікім сьвятам, гаманілі дужа многа і абы-што, і ўсё з адбіткам незразумелай хваравітасьці, быццам усіх схапіла трасца.

А рана-параненьку па ўсіх дарогах пацягнуліся ці вельмі гаманлівыя ці зусім немыя фурманкі з мужыкамі й жонкамі, братамі й сёстрамі, бацькамі і сынамі— на зборны пункт у горад.

Так пачалася тая страшная вайна, і ўва ўсіх тады была толькі адна пацеха: вайна як пішуць, будзе вельмі кароткая, скончыцца яшчэ нават, мо̄жа, да зімы.

Ды вось была ўжо і зіма, ішлі бясконцыя наборы некрутаў, і запасных, і ратнікаў, за новыя і новыя гады, прышла вясна, другое лета,—і здавалася, канца гэтай нудзе ня будзе...

Людзей паменшала, дзяўчаты пасмутнелі без хлапцоў і вясёлых кірмашоў, старыя-ж былі ўсе раздражнёныя і цераз сілу ўстрыманыя, як перад споведзьдзю ў вялікі пост.

Тужлівасьць і нуда запанавалі ў хатах. Зацяглая і безнадзейная вайна, як хмара, павісла кожнаму, і пад яе шэраю заслонаю не хапала даўнейшага сонейка і вясёлых яго кос.

Не давала рады прысілёная пабожнасьць дзядоў і бабулек. У царкве было пуста на мужчынскім правым баку і засмучона на дзявочым левым. Не карціла цяпер і дзяўчатам хадзіць сюды: там цяпер кожнае сьвята адпраўлялі малебны за здароўе, а часам, і ўсё часьцей, і панахіды.

Дзяўчатам прыямней стала хадзіць у воласьць і на пошту, дзе было можна хоць што-небудзь пачуць аб іхных судольніках даўнейшага жыцьця.

Дзяўчаты мяталіся цяпер з лістамі, як-бы ўсе яны былі пісьменныя... Але што раз, то горшыя прыходзілі навіны: гарадчаніна Хвядоса, што некалі разбурыў торг у Малкі, забіла дзесьці бомбаю з аэро-

пляну. Петрыку трохі пашчасьціла, бо трапіў у палон здаровы (Аўдолю дражнілі векавухаю); пра многіх-жа хлапцоў ня было ніякіх вестак па цэлых месяцах—мусіць, яны былі ўжо забітыя.

Хомка цяпер рупліва спраўляў усю гаспадарскую работу: за сябе, за Петрыка і за старога. Як забралі адзінага сына, стары на ўсё махнуў рукою, ня дбаў аб гаспадарцы і здаўся на парабка. І Хомка чуў на сабе павіннасьць дагледзіць усё чыста, як сваё.

Яшчэ два гады аставалася да Хомчынага году, аж вось аднойчы ўвечары прышоў да ягонага гаспадара ўстрывожаны, аж пахудзелы, бацька і сказаў, што і Хомку запісалі.

Усе людзі наракалі на парадкі ў валасьці: як можна гэтак памыліцца, каб запісаць хлапца раней на два наборы? Усе казалі, каб Юрка сам схадзіў у валасьць.

— Як-жа ж так? Яны самі павінны агледзіцца, нашто-ж яны вучоныя?—жаліўся Юрка, цягнуў-цягнуў і-ткі сабраўся неяк схадзіць.

— Усе ведаюць, пане пісар,—з не яго мяккасьцю і ўпрасьлівасьцю казаў Юрка,—усе ведаюць, калі радзіўся мой сын Хама...

— Ах, што мне да ўсіх?—адганяўся, як ад мухі, лысы пісар;—ну, дзе-ж ты быў дагэтуль? Памеціў бацюшка пад 1896 годам, дык што я вінават? Трэба-ж было казаць! Во са сьпіскамі ня ўпраўлюся, бадай яно трыкраты сацьмела на чыстым полі...

— Адкасьніцеся вы дзеля бога ад мае беднае галавы! Ня лезьце ў канцылярыю, чакайце ў зборнай!— крычэў ён на ўсіх мужчын і баб агулам.

Калі Хомка пакідаў гаспадара, каб дні са два пажыць у бацькі, стары адпускаў яго ня горш, як некалі выпраўляў свайго сына Петрыка. Усё ён нагінаўся да подалу даўгой кашулі абціраць сьлёзы. Даў Хомцы сярэбраны рубель, пацалаваўся—і зараз маўкліва паплёўся на гумно трэсьці салому. Безгаловая малеча дапільнавала дзеда, што ён там нямаведама і з кім брахаўся, крычэў, як баба, біў саху мятлою. Малеча кінулася ад гумна ўцякаць, каб з радасьцю пераказаць у хатах, што дзед, мусіць, зьдзяцініўся. Але маткі не патуралі іхным навінам, прыстрашылі іх матузамі і, самі невясёлыя, маўчалі.

Два дні прагуляў Хомка ў сваёй хаце. Маці спрагла яму яешню, наўмысьля для яго, і Хомцы было надта сорамна, што яму такая чэсьць. Ён падзяліў яешню на сем роўных частак: як сабе, так і бацьком, і меншым брацікам і сястрычкам. Пакаштаваў трошку— і аддаў і сваю частку малой Тацянцы.

Начаваць ён пайшоў у сяніцу, на сьвежым сене, пад бацькавым кажухом.

А ўжо з вечара надвор'е пачало хмарыцца; курыў і пыліў дождджык.

Хомцы ня спалася. Дождж аднастайна, ціха і прыемна, бязупынку шуршэў па стрэсе, зрэдку пыхала нядужая бліскаўка, і шугаў рабінаю вецер. Вада

сьцякала цурочкамі і бурбоніла ў падстаўленую маткаю даёнку. І Хомка слухаў, слухаў—і думаў.

Ён меўся абмеркаваць усё з усіх бакоў, усё ўцяміць, што і як... І сам ня ведаў: жаль яму, ці не?

І толькі лезьлі ў галаву ўспаміны, як раней здалося-б радасьцю ня весьці ў такую хлюпу гаспадаровых коні на начлег у поле, а ляжаць пад стрэшкаю на сухім сянцы, акрыўшыся цёплым кажухом, і пад гоман дажджавых капак думаць, што наша доля яшчэ ня дужа дрэнная.

І вось ён у бацькоў; дзеля яго праглі яешню, як для дарослага і поўнапраўнага; ён слухае сабе спакойна, лежачы ў сухім, як ідзе дождж... Але даўнейшай радасьці зусім няма.

Ён цяпер прыбярэцца ў прыгожую «форму», штодня, як кажуць, будзе есьці любовае мяса, убачыць вялікія гарады, шмат усякіх паноў з іхнымі штукамі, убачыць трамвай і электрычнасьць. Ды нейкае «ўсё роўна» ахоплівае думку... Няма цікавасьці. «Усё роўна» ахоплівае думку аб сваім хатнім, дарагім і любым, ды як падумаць—жалкім і ўбогім. «Усё роўна» зьвязана і з будучыняй—невядомай, страшнай, а цяпер неяк і мала ўжо цікавай.

Калі-ж Хомку выпраўлялі, надвор'е і дарога папсаваліся ў канец, было гразка і сьцюдзёна. З неба то лілося як з вядра, то сыпаўся дождждык, дробненькі як пыл. «На добрую долю вяшчуе», сказаў нехта аб пагодзе Хомчынай маці, але маці яшчэ болей засмуцілася.

А за гаем, ужо на ростанях сустрэлі мокрага настаўніка. Спыніліся. І настаўнік цалаваўся з усімі хлопцамі і з Хомкам. Ён упусьціў заплаканыя непагадзьдзю акуляры з рук у лужу, і Хомка падняў іх яму. Усе глядзелі сёньня ўбок, і настаўнік глядзеў таксама ўбок, міма Хомчыных воч. Можа ад жалю, а можа дзеля свае няўзоркасьці.

Паехалі. Пабрыў у школу настаўнік, паставіўшы каўнер ад дождажу, а яны паехалі.

Домна галасіла на цэлае Асмолава, і гэтае матчына выцьцё гучэла Хомцы ў вушшу, як нешта непатрэбнае і прыкрае, да самага гораду. Не выхадзілі з галавы Нупрэіхіны словы: «І Хомачку бяруць—саўсім піскленка. Ці здолее ён стрэльбу, бедненькі, насіць»...

Казарма і муштра заглушылі тое выцьцё і тыя словы. Ат, што! Тут-жа было ў сто рэдзь горай, чымся ў батракох. Кормяць горш, як гаспадар Куртгу; заўсёды нечага ня хопіць: порцыі мяса ці кашы. Спаць хочацца нязвычайна. Цела ные і сьвярбіць, як-бы што па ім бесьпярэч глабаецца. Палаці, або нары—нязручныя і брудныя. Цесна,—у невялічкім бараку дзьвесьце з гакам чалавек. «Восьмая рота, літара Б, барак № 29», мармоча сабе Хомка. Асмолава—як сон. Ня імецца веры, што было яно ў яго жыцьці. Яно балюча прыходзіць у галаву толькі тады, калі заможным таварышом прысылаюць з дому грошы і пасылкі. Хомка нікому ня шле лістоў, і яму ніхто ня шле. Шыбка пісаць ён ня ўмее, а лежачы на

палацях, упоцемку, пісаць—дужа нязручна і марудная справа.

І думак не зьбярэш, калі навокала гыркаюць: ня так сеў, ня так крутнуўся, ня так адказаў. А гэтыя жудасныя, на кожным кроку, зьняважаньні маткі—крояць сэрца. Здавалася, ніхто не разумее, не спачувае. Аднак, нешта аднаго разу, новабранец другога ўзводу, нязграбны, сутулаваты і з тварам у рабацьці яўрэй з Дуброўны, што некалі прыяжджаў у Амсолава скупліваць яйкі і баравікі, екатліва закрычэў у вадказ аддзялённаму: «Мая маці ня сучка!»—загуў і выскачыў з строю. Хомка ўцяміў, што ён не адзінокі ў сваіх думках. Хлопчык-прапаршчык, сам ужо добра заўчоны на тую лаянку, пры гэткім выпадку пачырванеў і засумяціўся, а Хомка здаволена зразумеў, на чыёй старане праўда.

Дні здаваліся тыднямі, тыдні—месяцамі, а калі адбілі ў полк тэлеграму з Рыгі, здавалася, працёк адзін дзень—даўжэнны, але парожні. Хомка з таварышамі ўсьцешыўся, што паедуць на пазыцыю,—было цікава, хоць троху і страшнавата. Увечары ішлі яны ў новенькіх, з пахам дзёгцю ботах, у шынэлях з пахам молі ці больніцы, шлі з песьняю па мокрай брукаванай вуліцы, і было надта дзіўна, што вуліца мае звычайны выгляд, снуюцца экіпажы і хапаюцца пешаходы, як быццам-то маршавая рота на пагулянцы, а ня ідзе на вайну. Усю ноч гармідэрылі на вакзале, а ў золак пад іграньне палкавое оркестры цягнік пайшоў. Камандзірша ў жоўценькіх гладзень-

кіх скураных пярчатачках махала беленькаю насатачкаю; нейкая цётка ў стаптаных лапцёх, прыпаўшы на плячо зьбялелай маладусе, раўла і смаркалася, а з цяплушкі няслося «вура», шматкі прыпевак і зык гармоніка. Міналася спусьцелае поле і голыя гайкі, і мільгалі на спатканьне тэлеграфныя слупы. Міма надта адлеглых хатак плыло бліжэйшае, зважаючы на сябе Хомчыны вочы...

І так паехалі.

2.

Вазьмі, маці пяску жменю,
Пасей, маці, на каменю:
Як прыжджэшся пяску ўсходу,—
Тады верне сын з паходу...

З народнае песьні.

На трэці дзень прыехалі на глухую невядомую пляцформу з незразумелаю назваю і чарапковымі дахамі на будынках.

Вёрст пяць ішлі па шосы да баронскага двору, дзе знаходзіўся штаб корпусу. Там пасілкаваліся. Выходзіў корпусны і прамаўляў да іх, кусаючы канцы жаўтава-сівых вусоў. Ён віншаваў іх, што малайцамі прыехалі на фронт, і жадаў ім стойка бараніць веру, цара і ацечаства...

Потым ізноў некуды пацягнуліся, і ноч мінулася ў дарозе, сярод вялізнай цёмнай пушчы. Зьбіваліся ў каўдобінах, зьяжджалі па коўзкіх убочынах дарогі

ў глыбокую канаву. Там-сям у лесе цьмелі чырвоныя вогнішчы, акамянелі прыкручаныя вузьдзечкамі да дрэў казачыя конікі, цямнеліся фурманкі, кухні. Хомка зьнямогся і ледзь пераступаў нагамі. На прывалах ён валіўся на памоклае лісьцё, як забіты, і каб ня ласкава-насьмешлівы покрык і лёгкі высьпятак тавары шаў, ён-бы ня ўзьняўся. Хомка меўся абмеркаваць усё з усіх бакоў, усё ўцяміць што і як, што і як... жаль яму, ці не? І толькі лезьлі ў галаву ўспаміны, здавалася вялікім шчасьцем, як некалі ляжаў на начлезе пад густою елкаю, калі буйны дождж шамацеў у яе лапах... Цяпер хатыль і амуніцыя да нуднага болю гнялі яго. І толькі халадок раньня крыху ўзбадрыў. Разьвіднелася. У шэрай імгле паветра чулася глухое дрыжачае гудзеньне мотора.—«Аэроплян! Аэроплян! — пракінулася па радох. Задраліся галовы.—«У хлябу і то каланіца яго носіць»,—прабурчэў нехта. Хомка насілу згледзіў у небе плямку самалёта і падумаў: «Во падзівіліся-б асмолаўскія бабы і дзяўчаты на такую штучку,—не далі-б веры». Пад абед дайшлі да штабу палку, дзе іх аглядаў палкоўнік і таксама павіншаваў, што нарэшце дабраліся да яго, і прамовіў сур'ёзна: «Ну, хлопцы, покуль што ў нас заціш, а скора, скора будзе гарачая справа... прывыкайце!»

Пачалася гарачая справа раней, чым тое думаў сам палкоўнік.

Яшчэ новенькія воіны не агледзеліся ў акопах і бліндажох, начальства ня ведала іхных іменьняў.

Толькі Шпака прыкмеціў фэльдфэбаль, зьвярнуўшы ўвагу на яго мізэрны выгляд, і спытаўся: «Ты з хахлоў?»

— Не,—адказаў высіленым голасам Хомка на начальніцкую блізкасьць і меў ад свайго ўзводнага дакор, што трэба казаць: «Нікак нет!»—і не забывацца на вайсковую навуку. Рыхтаваўся Хомка дадаць: «Магілеўські», ды яны ўжо пакінулі яго.

Ён улез у нізенькую, цесную зямлянку, прытуліўся ў куточку на зямлю і, адпачываючы, зусім шчыра і здаволена падумаў: «Казалі, што будзе дужа дрэнна... А тут, як пад асецьцю: і цёпла, і прытульна, ні ветру ні дажджу»...

Ён задрамаў, але, ня гледзячы на зморанасьць ува ўсім целе, ніяк ня мог заснуць глыбока.

Бясконцаю і хваравітаю чаргою заварушыліся ні-то ўспаміны, ні-то сьненьні...

⁂

Зіма. Досьвіткі. Авечкі трэба рэзаць...

З лучынкаю пад гарцам ці ў гарлачы, каб вецер не згасіў, ідуць па двары ў пуню. Чорна... У хлеве карова стаіць і жуе жвачку. Авечкі ляжаць грудком ля сьценкі. Вось адна жуе саломку, шыбка ўбіраючы яе сьмешным ротам. Павярнула галоўку на сьвятло. Вочы блішчаць, як у таго ката ў цямноце, як быццам у іх гарыць крывава-бліскучае сьвятло. Трэба лавіць: расставіўшы рукі, трэба хапаць за бакі, за воўну...

Уцякаюць... Шурай іх! Злавілі. Б'еца ў руках, ірвецца... Вядуць, ушчаміўшы шыю праміж ног. Ці ведае-то яна, што на сьмерць вядуць? У хаце тупае капыткамі па масту, бляе. Дзеці прачынаюцца. Яны хочуць глядзець, а на іх крычаць, і яны лезуць на печ, дзе можна ляжаць на цёпленькім і глядзець, як будуць рэзаць. Нож нагостраны. Карытца падстаўляе матка пад шыю.—«Бяры за пярэднія ногі»,—трывожна кажа бацька. Адагнуў галаву авечцы крута назад... Адхінаецца на печы Хомачка: цяпер глядзець ня можна... І ўжо трапечацца зарэзаная бацькам авечка слабей-слабей... Ледзь-ледзь... Пусьцілі: асьвяжылася авечка. Галава з парэзанай глыбока шыяй адхіснулася, ногі дубеюць, выцягнуліся. Бацька стаіць з закасанымі рукавамі, з нажом, абпэцканым у кроў. І пальцы ў яго ў крыві—як які душагуб, нават насупіўся і сапе носам. Узяў за нагу, за капыток, і абрэзаў скурку колцам, як хлопчык абразае кару на лазіне, зьнімаючы дудку. І другую ножку так, і ўсе ножкі. Потым закасаў на нагах скурачку. Мяса белае... Прасадзілі палку ў заднія ногі пад жылы, прывязалі вяроўку да палкі, закінулі на курчыну і пачалі цягнуць. Падцягнулі авечку за ногі высока, галавою крываваю ўніз,—вышэй, ніжэй, каб зручней лупіць. Прывязалі. Галава баўтаецца і крывяніць. Бацька падперазаўся матчыным хвартухом і разразае скурку па бруху ад шыі аж да хваста. Потым падсаджвае ножыкам, пальцамі і кулакамі паміж скуркі і мяса. І скурка ўсё болей адлупліваецца, як адсачалая

кара вясною. Тады яна зрабілася сьмешная,—аблупленая авечка...

Яшчэ-ж трэба патрашыць... Маці падстаўляе ночвы...

— «А-я-я! акотная!—лемантуе бацька.—«Як-жа гэта ашукаліся?»—дзівіцца маці. Бацька дастае з нейкім пузыром разам і выкладае на зямлю, дужа асьцярожненька, парачку сьлізенькіх ягнятак. У іх чорная, прыгожая, як у паноў на каўнярох, кароценькая, курчавая шэрстачка. І дужа вялікія, буйныя галоўкі. Разглядаюць іх, і бацька кажа: «Бараны былі-б... ня шкода!»

*

— Што вы, братцы, разьляглісся спаць, як бараны? Жыцьця ня шкода?—кажа трывожным голасам узводны, будзячы і выганяючы ўсіх людзей з зямлянкі.—У госьці вы прышлі ці што? Бяжы хутчэй у акопы... Немец наступае!

Быў ужо вечар, было цёмна.

Затукалі недзе з бакоў кулямёты і пачалі бухаць гарматы.

Загудзела ў паветры; першая граната з страшным трэскам глушачы ўсё, разарвалася ў драцяной загарадзі, раскінуўшы подалек камы зямлі.

У Хомкі затыхала сэрца, ён машынальна прысеў і прытуліўся ля байніцы.—«Нічога, нічога, браткі!»—казаў з мімавольнаю пярэрваю ў голасе ротны:—

«Будзем адбіваць атаку, ня бойцеся, дасьць бог, прывыкнеце... Нічога, нічога»... Чарнабароды туляк бурчэў, калі ротны троху адышоўся: «Табе нічога, нічога, як у цябе ў Расіі, можа, маёнтак ёсьць, а ў мяне—што? Галодная баба і пяцёра малых». Ніхто не падтрымаў тульскага, ніхто не асудзіў, а ўзводны зусім не ўзлаваўся, а толькі буркнуў: «А, брэшаш, ня ведаючы: наш ротны сам з мужыкоў»—«Пасьля вайны нарэжуць зямлі»,—сказаў другі.—«Нарэжуць тры аршыны, можа каму яшчэ сёньня», не маўчаў тульскі, адварочваючы ўвагу ад страшэннай канонады.

Яшчэ некалькі знарадаў, адзін па адным, вухнуліся блізка за акопамі. Хомка адхіснуўся ў куток і зрабіў крыж дрыжачаю рукою, трасучыся ў гнятучым чаканьні.

З глухім гулам ляціць яшчэ. І на момант раптам усё змоўкла. «Міма, міма!» здавалася ў вушшу. А грымотны крэх захістаў бярозы і зямлю, задрыжэлі і пасыпаліся зямлёю акопы, калаціліся і тыхалі рукі і ногі, а тады зьнямелі. Хомка прыціснуўся, прытуліўся, а нешта балюча таўханула яго ў жывот.—«Што гэта такое?»—падумаў ён, спалоханы. Яго ўкінула ў пот, замлявіла, бажалася вады. Прамільгнуў воблік маткі, Ганутькі, завіляла хвастом Курта. Ён трапіў у глыбокі сумёт, праваліўся ў сьнег,—і ўсё глыбей... А ўзлаваны гарадчанін шпурляе і шпурляе ў яго больнымі крамянымі сьнежкамі—«За што?»—са сьлязьмі і так ціха, што ня чуваць і сабе самому, пытаецца Хомка,—за

што?!»—шэпча ён усё цішэй. І глыбокая, распачлівая крыўда кроіць яму сэрца.

Жах абняў хлопчыка, і ён валіцца наскрозьдоньня, глыбей і глыбей. Высока, хто ведае дзе, крычыць на краю фэльдфэбаль: «Насілкі!».

І змоўкла ўсё, няма нідзе ані гуку.

— Нашто тут насількі?—кажа ротны:—ён забіт, падбірайце толькі раненых!

У чорнай мгле блішчаць, яскрацца гострыя іголкі, тупеюць, зьнікаюць і зьліваюцца ў нішто...

ЗЬМЕСТ

Стр.

P